Пролетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 334 (4240)
Серада, 16 сьнежня
1931 г.

МЕНСК, Савецкая 63

Сёньня ў нумары

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВАЯ—Да раённых партканфэрэнцый (1 стар.).
Ф. КІПЕР—Паштрупы ў барацьбе за прамфінплян (2 стар.).
М. КЕКРЫЧ—Як выглядае «ажыўленьне ў ангельскай прамысловасьці (3 стар.).
Саўгасы Малакапрамтрэсту—на апошнім месцы па загатоўках (1 стар).
Рашуча змагацца з асяданьнем таварнай прадукцыі ільну на вёсцы (1 стар.).
Апошнія весткі з фронту індустрыялізацыі (1 стар.).
Перабудова партработы на вёсцы (2 стар.).
Пленум Менскага гаркому і ГарКК КП(б)Б (2 стар.).
Максымальна фарсаваць вывазку апалу і лесаматар'ялаў (2 стар.).
Хутчэй прасушыць тавар да спажыўца (3стар.).
Зьняць перашкоды са шляху разьвіцьця гаспадарча - разрахунковых брыгад (3 стар.).
Загатоўні насеньня кармовых траў праходзяць маруўна (3 стар.).
За жалезную дысцыпліну на транспарце (4 стар.).
КІТАЙ—Падзел Кітая пачаўся.
Завастрэньне супярэчнасьцяй паміж капіталістычнымі дзяржавамі (4 ст).

ДА РАЁННЫХ ПАРТКАНФЭРЭНЦЫЙ

У бліжэйшыя дні пачынаюцца раённыя партыйныя канфэрэнцыі. Мы знаходзімся напярэдадні XIV зьезду КП(б)Б і XVII усесаюзнай партыйнай канфэрэнцыі. За мінулы час — з XIII зьезду КП(б)Б і XVI усесаюзнага зьезду — наша партыя дасягнула вялізарнейшых посьпехаў ва ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва. За апошні год мы дасягнулі вялізарнейшых пістарычнай важнасьці посьпехаў у завяршэньні фундамэнту сацыялістычнай эканомікі. Вось чаму наша партыя мае зараз магчымасьць канстатаваць, што пытаньне: «хто-каго» вырашана ў карысьць сацыялізму ня толькі ў прамысловасьці, але і ў сельскай гаспадарцы.

Наша сацыялістычная сыстэма гаспадаркі дэманструе штодзенна, штогадзінна перад пралетарамі ўсіх краін сваю перавагу, свае посьпехі. Ва ўсіх капіталістычных краінах адбываецца працэс распаду, загніваньня гаспадаркі. Капіталістычная вытворчасьць ня толькі стаіць на надзвычай нізкім узроўні, але адбываецца далейшы працэс скарачэньня вытворчасьці. Крэдыт ны і валютны крызіс напырыўся ў гэтым годзе з нябывалай у гісторыі сілай. У той час, як у нашай краіне ліквідавана беспрацоўе, узьнімаецца матар'яльны дабрабыт самых шырокіх пластоў працоўных, у капіталістычных краінах адбываецца новай сілай зьбіваньне мас, сотні тысяч і мільёны рабочых выкідваюцца на вуліцу, асуджаюцца на галаданьне і на галодную сьмерць.

Мы тут на мяжы з фашыцкай Польшчай зьяўляемся сьведкамі таго, як сотні і тысячы працоўных Заходняй Беларусі імкнуцца трапіць у краіну Саветаў, у краіну, дзе кожны год будуюцца і пашыраюцца сотні і тысячы новых і старых заводаў, у краіну, якая кожны год паглынае новыя мільёны пашаўненьняў на свае заводы і фабрыкі, у краіну, у якой бядняцка-сераднцкія масы сялянства дасягнулі вялізарнейшых посьпехаў па шляху да сацыялістычнай пераробкі сельскай гаспадаркі.

КП(б)Б пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК УсеКП(б) у агульным змаганьні нашай партыі за пабудову сацыялізму дасягнула за мінулы год вялікіх посьпехаў ва ўсіх галінах будаўніцтва. Калі ў 1930 г. удзельная вага прамысловай прадукцыі ў адносінах да ўсёй прадукцыі, якая вырабляецца ў краіне, была роўна 38,7 проц., дык у 1931 годзе ўдзельная вага яе падняслася да 53 проц. Гэтыя лічбы асабліва паказальны, калі ўлічыць тое значнае разьвіцьцё, якое атрымала сельская гаспадарка за гэты-ж перыяд. Гэтыя лічбы зьяўляюцца выяўленьнем вялізарнага капітальнага будаўніцтва, выяўленьнем буйнога развароту ўсёй прамысловасьці. Як растуць нашы прадпрыемствы, відаць хаця-б з наступных лічбаў: калі на 1/1 1930 г. у БССР было ўсяго 10 прадпрыемстваў з колькасьцю рабочых больш 1.000 на кожным, дык на 1/VII 1931 г. такіх прадпрыемстваў налічваецца ўжо 27. За 10 месяцаў 1931 году прадукцыя рэспубліканскай прамысловасьці павялічылася параўнальна з тымі-ж месяцамі 1930 году прыкладна на 53 проц. Цэлы рад галін прамысловасьці выканалі пяцігадовы плян за два з паловай і за тры гады.

Аднак, ня гледзячы на гэты вялізны рост, прамысловасьць ня выканала ні колькасных, ні асабліва якасных паказальнікаў. Ня выканан плян павышэньня прадукцыйнасьці працы. Зусім недапушчальна стаіць справа са зьніжэньнем сабекошту. Замест зьніжэньня сабекошту на 8,1 проц. па прамысловасьці ВСНГБ — зьнижан толькі на 1,7

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

ПЕРАБУДОВА ПАРТРАБОТЫ НА ВЕСЦЫ

вырашае посьпехі арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў

Важнейшая задача сельпарткомаў

Мінулы вопыт работы сельпарткомаў паказвае даволі значны зрух у справе павышэньня кіруючай ролі прымацаваных да СНК калгасных парт'ячэек, у справе барацьбы за арганізацыйна - гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў. Большасьць калгасных і сельскіх ячэек, што абслугоўваюцца сельпарткомамі, бліжэй падыйшлі да ажыцьцяўленьня канкрэтных задач правільнай арганізацыі працы ў калгасах па аснове ўкараненьня ва ўсе галіны работы выдзельнічыны, ацэнкай у працадніёх, шляхам барацьбы за ліквідацыю абязьлічкі ў рабоце і дробна-буржуазнай ураўнілаўкі ў разьмеркаваньні ўраджаю і даходаў у калгасах. Парт'ячэйкі, працуючы пад непасрэдным кіраўніцтвам сельпарткомаў, ва многіх выпадках ідуць наперадзе па выкананьні чарговых гаспадарча - палітычных задач, забясьпечваючы гэтым посьпехі масавай работай сярод калгаснікаў, мабілізацыяй іх на рашучую барацьбу супроць кулацкіх, рвацкіх тэндэнцый, якія маюць адлюстраваньне ў радзе калгасаў і асабліва выявіліся ў часе правядзеньня збожжазагатоўчай кампаніі, базьлітаснай барацьбой з правымі і «левымі» апартуністамі і прыміранцамі.

Найбольш паказальны посьпехі па выкананьні вузлавых задач калгаснага будаўніцтва ў рабоце тых сельпарткомаў, якія ў пачатковай стадыі іх арганізацыі занялі сваё месца і правільна ўсьвядомілі сваю ролю ў сыстэме мерапрыемстваў партыі па перабудове партработы ў вёсцы ў адпаведнасьці з новай абстаноўкай і задачамі, якія па-бальшавіцку ўзяліся за практычнае ажыцьцяўленьне ўмоў тав. Сталіна, высунутых ім на нарадзе гаспадарнікаў.

БССР — адзін з важных раёнаў Савецкага Саюзу па разьвіцьці сацыялістычнай жывёлагадоўлі і тэхнічных культур. Ужо сам напрамак спэцыялізацыі гаспадаркі гаворыць за тое, наколькі важна задача аўладаньня тэхнікай жывёлагадоўлі і агратэхнікай паогул, наколькі актуальна задача барацьбы па выкананьні абязьлічкі, ураўнілаўкі і іншых тормазаў арганізацыйна гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў і павышэньня прадукцыйнасьці працы ў саўгасах.

Многія сельпарткомы ўсьвядомілі задачы перабудовы работы ў вёсцы на аснове рэалізацыі 6 сталінскіх умоў. Гэта палажэньне праілюструем некалькімі канкрэтнымі фактамі.

Замбінскі сельпартком (Барысаўскі раён), маючы два буйныя жывёлагадоўчыя саўгасы і больш 20 калгасаў, асноўную ўвагу сканцэнтраваў на задачах правільнай арганізацыі догляду жывёлы. У саўгасах і 18 калгасах уведзена сапраўдная вызьдзельная работа. Многае зроблена ў адносінах ліквідацыі абязьлічкі. Гэтыя мерапрыемствы забясьпечылі павышэньне ўдою кароў на 8 проц. і зьніжэньне на 15 процантаў захворваньня сьвіней у ЮСТФ. Сельпартком за час справаздачна - перавыбарчай кампаніі парторганаў забясьпечыў 100-процантнае выкананьне плянаў збожжа і мясазагатовак.

Забясьпечыўшы поўнае выкананьне плянаў камплектаваньня жывёлагадоўчых ферм, Негарэльскі сельпартком (Бойчанаўскі раён) па-сапраўднаму ўзяўся за справу аўладаньня тэхнікай. Арганізаваны курсы па вывучэньні тэхнікі жывёлагадоўлі, арганізацыі працы ў калгасах і трактарнай справы. У мэтах палажэньня матар'яльна - бытавога абслугоўваньня рабочых саўгасаў з часу арганізацыі СНК пабудован рабочы пасёлак, клюб, арганізавана сталовая на 250 чалавек і інш.

Сталінскі сельпартком дабіўся пераводу рабочых саўгасаў на прагрэсіўна-зьдзельную прэміяльную аплату. Для сямейных рабочых пабудаваны 33 новыя кватэры і 3 інтэрнаты для адзіночак. Пры апорным пункце працуе адзін гурток па вывучэньні тэхнікі і курсы рахункаводаў.

Правільнай расстаноўкай партсіл, арганізацыяй партгруп у калгасах, канкрэтным аперацыйным кіраўніцтвам гэтымі зьвеньнямі сельпартком забясьпечыў значнае палепшэньне работы калгасаў. Сельпартком рашуча рэагуе на мясьцінкія кулацкія тэндэнцыі. За скажэньне лініі партыі распушчана праўленьне калгасу «Новае жыцьцё», зьнята з работы 6 старшынь праўленьняў калгасаў. На месца хісткіх элементаў і яўных апартуністаў высунуты на кіруючую работу ў калгасах стойкія партыйцы і лепшыя беспартыйныя калгаснікі, якія паказалі сваю цьвёрдасьць у барацьбе з кулаком і правялі вялікія зьмоўласьці ў арганізацыйна - гаспадарчым умацаваньні калгасаў.

Найбольш слабое месца ў рабоце сельпарткомаў па ажыцьцяўленьні ўказаньняў тав. Сталіна — гэта пераводзка на гаспадарчы разрахунак саўгасаў. Мясцовыя партыйныя арганізацыі слаба вядуць барацьбу супроць коснасьці ў гэтым пытаньні частка гаспадарнікаў, супроць тэндэнцый ухіліцца ад кантролю рублём.

Невыстарчальна пастаўлена работа сельпарткомаў па разгортваньні сацыпаборніцтва і ўдарніцтва, у асаблівасьці яго вышэйшых форм. Асобныя парт'ячэйкі гэтым пытаньнем зусім кінулі займацца. Напрыклад, ячэйка калгасу «Беларусь», якая абслугоўваецца СНК пры саўгасе «Камінтэрн» (Бягомльскі раён), на працягу 6 месяцаў навет не правяла ні аднаго сходу. Апорная саўгасная ячэйка сельпарткому літаральна нічога не прадпрыняла ў адносінах указаньняў тав. Сталіна. У гэтым саўгасе ў поўным росквіце абязьлічка, якая прывяла да рэзкага пагаршэньня конскага складу і заўчаснай зношанасьці сельска - гаспадарчых прылад і машын.

Адзін з прычын буйнейшых недахопаў у рабоце многіх сельпарткомаў зьяўляецца адсутнасьць належнай увагі да іх, як да новых арганізацый у сыстэме перабудовы партработы па вёсцы, з боку райкомаў партыі. Напрыклад, Койданаўскі раён з часу арганізацыі сельпарткомаў кінуў цікавіцца работай прымацаваных да сельпартпрацы ячэек. На працягу паўгода ні адна з гэтых ячэек ня была абсьледавана райкомам. У гэтым-жа раёне арганізован Сьмядлоўскі сельпартком з 4 саўгасных парт'ячэек з прымацаваньнем толькі адзіх калгаснай. Гэта-ж проста нейкае «куставое аб'яднаньне» саўгасных парт'ячэек, а асноўная-ж задача ў арганізацыі сельпарткомаў — гэта забясьпечыць палепшэньне работы калгасных ячэек.

Зараз у арганізацыях КП(б)Б заканчваецца справаздачна - перавыбарчая кампанія бюро парт'ячэек. Ужо праходзяць раённыя партканфэрэнцыі. Важнейшай задачай перад кожнай раённай арганізацыяй зьяўляецца — па-бальшавіцку мабілізацыя на поўнае ажыцьцяўленьне 6 сталінскіх умоў, як праграмы баявых дзеньняў за арганізацыйна - гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, за далейшыя посьпехі сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Я. Ів.

У баку ад вытворчых задач

Справаздачна-перавыбарчы сход Навасёлкаўскага сельпарткому (Веткаўскі раён) паказаў, што кіраўніцтва гэтага сельпарткому не паставіла ў цэнтр сваёй увагі асноўных гаспадарча-палітычных задач.

Сельпартком да гэтага часу не займаўся пытаньнем рэалізацыі ўказаньняў тав. Сталіна. У саўгасе «Навасёлкі» нічога не зроблена для таго, каб арганізаваць набор рабочай сілы. Сельпартком спадзяваўся на самацёк. Прэміяльна-зьдзельная аплата працы ў саўгасе ні ўведзена. Тарыфная сетка пабудавана на прынцыпе ўраўнілаўкі.

На ўсіх вучастках работы панае абязьлічка. Сельпартком вельмі мала цікавіцца пытаньнем палепшэньня матар'яльна-бытавых умоў рабочых. У апошні час у сталоўцы саўгасу павышаны цэны за харчаваньне, у той час, як якасьць апошняга не палепшана. Усё гэта выклікае цікучасьць рабочай сілы, прыводзіць гаспадарку да буйных недахопаў і страт. Завод, які ёсьць пры саўгасе, выканаў свой вытворчы плян толькі на 54 проц.

Ня лепшая справа і з арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньнем калгасаў. Гэтай вузлавой задачы калгаснага будаўніцтва СНК не паставіў у цэнтры сваёй увагі. Зьдзельнічыла ў большасьці калгасаў праводзіцца фармальна.

Вялікім недахопам у рабоце сельпарткому зьяўляецца тое, што кіраўніцтва яго недаацаніла ўсёй важнасьці перабудовы партыйнай работы, не праведзена правільная расстаноўка партсіл.

Неабходна адзначыць, што з боку РК КП(б)Б ня было прынята належных мер, каб своячасова выправіць недахопы.

Н. В..

Апорная ячэйка

павінна паказаць узоры бальшавіцкай работы

У саўгасе «Забучань» (Касьцюковіцкі раён) будаўніцтва праходзіць над звычай марудлымі тэмпамі. Да гэтага часу ня скончана пабудова цялятніка і жылога дому.

Партыйная арганізацыя саўгасу—апорная ячэйка сельпарткому—не перабудавала сваёй работы, не расставіла партсіл, асабліва на вядучых вучастках вытворчасьці. Далёка ня ўсе камуністы і камсамольцы ахоплены сацыпаборніцтвам і ўдарніцтвам.

Кіраўніцтва сельпарткому вельмі мала цікавіцца вытворчым жыцьцём саўгасу, не займаецца як належыць арганізацыяй работы на вытворчасьці. У саўгасе ўсё яшчэ ня зжыты ўраўнілаўка і абязьлічка. На многіх вучастках работы ня ўведзена зьдзельнічына. Масава-выхаваўчай работы ў саўгасе не праводзіцца.

Сельпарткому патрэбна неадкладна пераключыцца на рэалізацыю ўказаньняў тав. Сталіна, перабудаваць сваю работу і гэтым самым забясьпечыць поўнае выкананьне вытворчых плянаў саўгасу.

С. С.

„Работніцу і калгасніцу Беларусі"—у масы

Адозва першага ўсебеларускага зьезду калгасьніц да ўсіх калгасьніц і аднаасобніц БССР.

Мы, дэлегаткі 1-га ўсебеларускага зьезду калгасьніц, падагульваючы вопыт работы калгасаў, адзначаем, што ў барацьбе за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, якое зьяўляецца галоўнай нашай задачай у сучасны момант у галіне калгаснага будаўніцтва, надавычай высокую ролю адыгрывае друк.

Друк мабілізуе шырокія масы калгаснікаў і калгасьніц на актыўную барацьбу за выкананьне задач сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Друк дапамагае хутчэй зьнішчыць усе недахопы, якія ёсьць у калгасах, дапамагае лепш арганізаваць працу, хутчэй наладзіць працоўную дысцыпліну.

Друкам рашуча выкрываюцца кулацкія элементы і падкулачнікі, якія яшчэ да гэтага часу ёсьць у калгасах і якія імкнуцца падрываць іх з сярэдзіны.

Таварышы калгасьніцы і аднаасобніцы! Вельмі важную ролю ў справе мабілізацыі мас работніц, калгасьніц і аднаасобніц на выкананьне важнейшых задач сацыялістычнага будаўніцтва адыгрывае часопіс «РАБОТНІЦА І КАЛГАСЬНІЦА БЕЛАРУСІ»—выданьне ЦК КП(б)Б.

Часопіс у найбольш простай і зразумелай форме раскажвае нам аб нашых задачах, перадае вопыт работы лепшых фабрык, заводаў, калгасаў, па казвае, як трэба працаваць, жорстка б'е па недахопах у нашым будаўніцтве.

Часопіс знаёміць нас з міжнароднай рэвалюцыйнай барацьбой работніц і сялянак. Часопіс дае нам каштоўныя парады па сельскай гаспадарцы, медыцыне, па выхаваньні дзяцей.

Мы — дэлегаткі першага ўсебеларускага зьезду калгасьніц абвяшчаем сябе ўдарніцамі па распаўсюджаньні часопісі. Кожная з нас абавязуецца завербаваць на менш 20 падпісчыц на часопіс і самой акуратна выпісваць яе. Мы абавязуемся таксама падтрымліваць самую цесную сувязь з часопісьсю, асьвятляць на яе старонках вопыт нашай работы, выкрываць недахопы.

Мы абавязуемся вербаваць ударніц часопісі, арганізоўваць брыгады, якія будуць працаваць па заданьнях часопісі і ўдзельнічаць у рэйдах.

Прыехаўшы ў нашы калгасы, мы прыложым усе сілы, каб арганізаваць там газэты-штодзенкі і шматгражкі.

Мы—заклікаем пасьледаваць нашаму прыкладу ўсіх калгасьніц і сялянак аднаасобніц.

Бяроце і вы на сябе абавязацельствы па папулярызацыі і распаўсюджаньні нашай часопісі.

Будзем дабівацца выкананьня пастановы ЦК КП(б)Б аб давядзеньні ліку падпісчыц на часопіс да 30.000.

Прымем самы актыўны ўдзел у рабоце нашага бальшавіцкага друку — самай моцнай, самай вострай зброі партыі.

Група дэлегатак усебеларускага зьезду калгасьніц.

ПЛЕНУМ МЕНСКАГА ГАРКОМУ і ГарКК КП(б)Б

14 сьнежня адкрыўся аб'яднаны пленум Менскага гаркому і ГарКК КП(б)Б. У парадку дня: 1) **арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, 2) аб перабудове работы гарадзкой арганізацыі ЛКСМБ і 3) пытаньні гарадзкой канфэрэнцыі.**

***

Па першым пытаньні парадку дня дакладваў тав. **КАРАНЕЎСКІ.**

— Менская партарганізацыя,—гаворыць дакладчык,—цьвёрда і няўхільна змагаючыся за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі, супроць правага і «левага» апартунізму, і прыміранцтва, дабіліся вялізарных посьпехаў у справе сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Зараз удзельная вага сацыялістычнага сэктару ў раёне складае 83 проц. За мінулы год значна пашырана пасеўная плошча, павялічылася вытворства с.-г. прадукцыі.

У раёне арганізаваны 52 садова-гародныя фэрмы, якія далі сёлета Менску асноўную масу прадукцыі. У 56 МТКФ зараз налічваецца 5.919 штук буйной жывёлы. У гэтым годзе фэрмы далі гораду 1.845 тон малака і 79 проц. усяго ўдою. Такія ў аспоўным паказальнікі гаспадарчай эфэктыўнасьці калгасаў раёну.

Перад нашай партарганізацыяй зараз ва ўсёй шырыні стаіць задача, вузлавая цэнтральная задача калгаснага будаўніцтва — арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў. У раёне налічваецца 125 калгасаў, якімі яднаецца 68 проц. бядыцка-сярэдняцкіх гаспадарак. Арганізацыя працы ва многіх калгасах пастаўлена яшчэ вельмі дрэнна.

Возьмем пытаньне ўвязьненьня зьдзельнічыны. Трэба сказаць, што гэта важнейшае мерапрыемства ў справе арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў праводзіцца ў жыцьцё вельмі павольна. Вакол гэтага пытаньні мы маем яшчэ да гэтага часу больш разважаньняў, чым канкрэтнай справы. У калгасе імя Варашылава (Ратамскі сельсавет), імя Сталіна (прыгарадны сельсавет), у радзе калгасаў Самахвалавіцкага сельсавету фактычна няма пішкай зьдзельнічыны.

У часе асенняй гаспадарчай кампаніі ў некаторых калгасах на працягу месяцаў не запісваліся ў кніжкі калгаснікаў працадні, а ў канцы месяца агульная колькасьць працадзён «раскладалася» на ўсіх калгаснікаў пароўні. Хіба-ж такія, з дазволу кажучы, мэтады могуць стымуляваць павышэньне прадукцыйнасьці працы, узмацненьне працоўнай дысцыпліны? У найбольш недапушчальнай форме праводзіцца ўраўнілаўка ў калгасах «Аградзізьне» (Папярнянскі сельсавет) і імя Будзённага. У гэтых калгасах натуральныя і грашовыя авансы выдаваліся ўсім пароўні бяз усякай залежнасьці ад затрачанай колькасьці і якасьці працы. Партыйныя ячэйкі на гэтыя факты не рэагавалі.

Абязьлічка—адзін з сур'ёзьнейшых тормазаў узьнікцця прадукцыйнасьці працы і даходнасьці калектыўнай гаспадаркі—займае ў нашых калгасах да волі шырокае месца. Імённа гэтымі прычынамі тлумачыцца тое палажэньне, што многія калгасы пры наяўнасьці выстарчальнай колькасьці рабочай сілы зацягнулі ўборку гародніны і бульбы. Гэтымі прычынамі тлумачыцца слабы догляд жывёлы ў калгасных таварных фэрмах.

Лістападаўскі пленум ЦК КП(б)Б даў разгорнутую праграму баявых дзеяньняў па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў. Задача нашай партарганізацыі, сельпарткомаў і ячэек—па-бальшавіцку мабілізавацца на поўнае ажыцьцяўленьне пастаноў пленуму, настойліва змагацца за правільную арганізацыю працы ў калгасах, за павышэньне іх таварнасьці. У гэтым напрамку патрэбна шырокая выхаваўчая работа сярод калгасных мас, мабілізацыя іх на базьлітасную барацьбу з усякімі спробамі кулацкіх элементаў падарваць калгасную вытворчасьць, разбурыць калгасы з сярэдзіны.

У часе правядзеньня збожжазагатовак найбольш выявіліся факты даволі папыраных спажывецкіх, рвацкіх тэндэнцый у калгасах і месьцінкіх буржуазных тэндэнцый у саўгасах. Бюро ГК і прэзыдыум ГарКК па-бальшавіцку ўдарылі па апартуністычных элементах, якія патуралі кулацкім тэндэнцыям, пакіраваным на зрыў плянаў збожжазагатовак. Некаторыя кіраўнікі калгасаў і саўгасаў прыцягнуты да суровай партадказнасьці; другія з іх выключаны з партыі. З таго часу вызначыўся некаторы пералом у выкананьні плянаў збожжазагатовак. Калгасамі збожжазагатоўкі выкананы ўжо на 82 проц. Наша задача—дабіцца ў бліжэйшыя 5 дзён поўнага выкананьня плянаў загатовак. Партыйныя арганізацыі на мясцох павінны ўжыць усе захады да хутчэйшага сканчэньня малацьбы, забясьпечыць поўнае разьмеркаваньне даходаў у калгасах да 15 студзеня 1932 году.

Мы ставім задачу павялічыць у 1932 годзе колькасьць рагатай жывёлы на 33 проц. і сьвіное стада—на 73 проц. Пасеў гародніны павялічваецца на 100 проц. і бульбы—на 62 проц. Такім чынам, працаёмкія культуры ў нашай прыгараднай гаспадарцы будуць складаць 40 проц. усіх культур. Ажыцьцяўленьнем гэтага плану мы забясьпечым поўнае задаваленьне патрэб гораду гародніной, бульбай і малаком. Задача парт'ячэек, сельсаветаў і калгасаў—зараз-жа прыступіць да практычнага ажыцьцяўленьня вызначаных плянаў, разгарнуць работу па падрыхтоўцы да веснавой пасеўнай кампаніі, праводзячы ўсё гэта пад знакам барацьбы за якасьць работы, за ўраджай, за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў. Толькі на аснове арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў мы зможам з посьпехам выканаць пляны, вызначаныя на 1932 год.

***

Выступіўшы ў парадку судакладу, тав. **Ждановіч** ахарактарызаваў становішча будаўніцтва, указаў прычыны невыкананьня плянаў пабудовы абор і сьвінарнікаў і спыніўся на некаторых канкрэтных фактах стану работы калгасаў.

БССР УКЛЮЧЫЛАСЯ ВА ЎСЕСАЮЗНУЮ ЛЯСНУЮ ЭСТАФЭТУ

Максымальна фарсаваць вывазку апалу і лесаматар'ялаў

Загатоўка лесу, вывазка яго, а таксама вывазка дроў і торфу праходзяць неадвальнаюча. Праграма чацьвертага кварталу на 1-га сьнежня значна недавыканана. ЗАГАТОЎКА будаўнічага лесу выканана на 40,7 проц., дроў—на 43,5 проц. Праграма па ВЫВАЗЦЫ дроў выканана ўсяго на 9,6 проц., лесаматар'ялаў—на 6,6 проц. і торфу—на 23 проц.

Створаны пастаянай ЦК КП(б)Б усебеларускі штаб садзейнасьці лесазагатоўкам і вывазцы апалу парашыў на сваім пасяджэньні 13 сьнежня ўключыцца ва ўсесаюзную лясную эстафэту і абагасьціць па БССР тры асноўныя маршруты. У задачы маршрутаў уваходзіць—поўнае забясьпячэньне лесазагатовак і вывазкі рабочай і гужавой сілай, г. зн. выкананьне пастановы Наркампрацы і Калгасцэнтру аб прыцягненьні да вывазкі лесу і торфу шляхам арганізацыі калгасных абозаў, 65 тыс. фурманак штодзенна; укараненьне брыгадных мэтадаў работы, пабудова драўляных і лежнявых дарог, рамонт інвэнтару і інструментаў, палепшэньне тэхнікі бясьпечнасьці, укараненьне зьдзельна-прэміяльнай аплаты працы, матар'яльна-бытавое і культурнае абслугоўваньне рабочых і г. д.

Раённым штабам садзейнасьці прапанавана распрацаваць канкрэтныя пляны ажыцьцяўленьня задач гэтых маршрутаў.

Усебеларускі штаб лічыць неабходным прымацаваць больш буйныя заводы БССР да рашаючых леспрамгасаў і торфазводаў і паспаць на лесазагатоўкі і вывазку РАБОЧЫЯ БРЫГАДЫ. Для дапамогі мясцовым арганізацыям і рабочым брыгадам усебеларускі штаб пастанавіў мабілізаваць адказных работнікаў: Наркампрацы—15 чал., Лесбепу—20 чал., Белторфу—15 чал., Нар. Кам. Аховы Здароўя—15 чал., Галоўсацстраху—15 чал. Наркамасьветы—10 чал., Белкаапсаюзу—15 ч. Перад ЦК ЛКСМ таксама пастаўлена пытаньне аб мабілізацыі 30 камсамольцаў для гэтай-жа мэты.

Для заахвочаньня раёнаў, леспрамгасаў, вучасткаў, калгасаў, брыгад і паасобных работнікаў пастаноўлена стварыць СПЭЦЫЯЛЬНЫЯ ПРЭМІЯЛЬНЫЯ ФОНДЫ ПРЫ ЛЕСБЕЛЕ І БЕЛТОРФЕ, прычым прэмі павінны выдавацца па заключэньнях цэнтральнага і раённых штабаў садзейнасьці.

Калі будуць пляны дастаўкі дроў на 1932 год?

Паводле закону аб кредытнай рэформе, спажыўцы павінны заключыць з Лесаснабсбытам дагавары на дастаўку дроў у 1932 годзе. Каб ня зрываць плянавай работы, гэтыя дагавары павінны быць заключаны зараз-жа. Між тым Лесаснабсбыт да гэтага часу не атрымаў плянаў дастаўкі дроў на 1932 г. ні ад Дзяржплану, ні ад ВСНГ.

Калі будуць гэтыя пляны?

Патрабна ўмяшаньне пракуратуры

НЯ ГЛЕДЗЯЧЫ НА НАПРУЖАНАЕ СТАНОВІШЧА З АПАЛАМ, РАД ФАКТАЎ СЬВЕДЧЫЦЬ АБ АГІДНЫХ АДНОСІНАХ ДА ВЫДАТКАВАНЬНЯ ЯГО, АСАБЛАВА ДРОЎ.

НАПРЫКЛАД, ГУТА «ПРАЛЕТАРЫ» ФАКТЫЧНА ВЫДАТКОЎВАЕ ШТОМЕСЯЧНА 7 ВАГОНАЎ ДРОЎ. 22 І 24-га ЛІСТАПАДА ГУТА АТРЫМАЛА 15 ВАГОНАЎ ДРОЎ, ЯКІХ ПАВІННА БЫЛО ХАПІЦЬ НА ДВА МЕСЯЦЫ. АДНАК, 11-ГА СЬНЕЖНЯ ПРАДСТАЎНІК ЗАВОДУ ЗЬЯВІЎСЯ Ў ЛЕСАСНАБЗБЫТ І ЗАЯВІЎ, ШТО НА ЗАВОДЗЕ ЁСЬЦЬ УСЯГО ДВУХДЗЕННЫ ЗАПАС ДРОЎ. ГЭТА ЗНАЧЫЦЬ, ШТО 15 ВАГОНАЎ ДРОЎ БЫЛІ СКАРЫСТАНЫ ЗАВОДАМ ЗА 19 ДЗЁН ЗАМЕСТ 2-Х МЕСЯЦАЎ.

ФАБРЫКА «КАМУНАРКА», ЗГОДНА ДАНЫХ СЭКТАРУ АПАЛУ ВСНГ, ПАВІННА ВЫДАТКАВАЦЬ У 1931 ГОДЗЕ 360 ВАГОНАЎ ДРОЎ, Г. ЗН. ПА АДНЫМ ВАГОНЕ Ў ДЗЕНЬ. ГЭТА ЛІЧБА НЯ РАЗ БЫЛА ПАЦЬВЕРДЖАНА САМОЙ ФАБРЫКАЙ. АДНАК, ЗА АПОШНІЯ ТРЫ МЕСЯЦЫ ФАБРЫКА АТРЫМАЛА 150 ВАГОНАЎ ДРОЎ, ЯКІХ ПАВІННА БЫЛО ХАПІЦЬ НА 6 МЕСЯЦАЎ. МІЖ ТЫМ ЛЕСАСНАБЗБЫТ 13-ГА СЬНЕЖНЯ АТРЫМАЎ ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ АД ФАБРЫКІ АБ ТЫМ, ШТО Ў ІХ ЗАПАС ДРОЎ УСЯГО 2-ХДЗЕННЫ.

ВЕЛЬМІ ДЗІЎНЫМ ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА І СТАНОВІШЧА НА ЗАВОДЗЕ ІМЯ ВАРАШЫЛАВА, ЯКІ, АТРЫМАЎШЫ 9-ГА СЬНЕЖНЯ 4 ВАГОНЫ ДРОЎ, ПІША 14-ГА СЬНЕЖНЯ, ШТО КАТЛЫ ЎЖО НЕ АЦЯПЛЯЮЦЦА 4 СУТКІ. А ЎВЕСЬ ГАДАВЫ ВЫДАТАК ЗАВОДУ СКЛАДАЕ СО ВАГОНАЎ, АБО 5 ВАГОНАЎ У МЕСЯЦ.

МЫ ЛІЧЫМ ВЕЛЬМІ ПАТРЭБНЫМ, КАБ НК РСІ І ПРАКУРАТУРА ВЫЯВІЛІ КАНКРЭТНЫХ ВІНАВАТЫХ У ДРАПЕЖНІЦКІХ АДНОСІНАХ ДА ВЫДАТКАВАНЬНЯ АПАЛУ І ПРЫЦЯГНУЛІ ІХ ДА СУРОВАЙ АДКАЗНАСЬЦІ.

ЭВ. КІПЕР

Партгрупы ў барацьбе за прамфінплян

«Сутнасьць бальшавіцкага наступленьня заключаецца ў тым, каб арганізаваць перабудову ўсёй практычнай работы прафсаюзных, каапэрацыйных, савецкіх і ўсіх іншых масавых арганізацый прыстасоўна да патрэб рэканструкцыйнага вэрыду» (Сталін). У сваёй пастанове ад 21 сакавіка ЦК УсеКП(б) даў выразныя ўказаньні, як павінны вытворчыя партыйныя арганізацыі перабудаваць сваю работу з тым, каб кожнае пізавое зьвяно вытворчасьці было забясьпечана канкрэтным і аперацыйным парткіраўніцтвам, што абумоўлівае сабою яшчэ большае паскараньне тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва.

Яшчэ ў чэрвені і ліпені г. г., у часе перавыбараў парторганаў, на фабрыках і заводах г. Менску была праведзена вялікая работа па разбуйненьні вытворчых ячэек, па ажыцьцяўленьні трохступеннай структуры вытворчых партарганізацый. У той час на менскіх прадпрыемствах было арганізавана каля 400 партыйных груп. Значная работа праведзена ў справе правільнай расстаноўкі партыйных сіл на прадпрыемствах. Партгрупы і партарганізатары ахапілі сабою пераважную большасьць пізавых вытворчых зьвеньняў.

Зараз Менскі гарком КП(б)Б шляхам брыгадных абсьледаваньняў і скліканьня парад парторгаў асобных галін прамысловасьці праводзіць праверку таго, як партыйныя арганізацыі менскіх прадпрыемстваў змагаюцца за выкананьне сакавіцкай пастановы ЦК УсеКП(б) аб перанясеньні цэнтру цяжару партыйнай работы ў цэх, брыгаду, групу.

Папярэднія вынікі праверкі даюць разгорнуты малюнак становішча партыйнай работы па прадпрыемствах Менску. Праверка дае магчымасьць пераканацца ў тым, што паказальнікі выкананьня вытворчых праграм знаходзяцца ў простай залежнасьці ад ступені рэалізацыі шасьці ўмоў тав. Сталіна, ад перабудовы партыйнай работы, ад таго, наколькі тая ці іншая партарганізацыя пчыльна падыйшла да вытворчага жыцьця прадпрыемства, наколькі яна чула рэагуе на кожную зьяву вытворчага працэсу.

Ударная брыгада стругалёў першага хромавага цэху заводу «Бальшавік» выканала прамфінплян другога кварталу на пяць дзён раней тэрміну: 104, 136, 125, 127 — вось якія лічбы (у процантах) на кожным квартале характарызуюць ход выкананьня прамфінпляну гэтай брыгадай. Брыгада імя XIII зьезду КП(б)Б (машынны цэх друкарні імя Сталіна) перавыканае сваю вытворчую праграму на 10 проц., дабілася максымальнага зьніжэньня браку, ліквідавала прагулы, дае значную эканомію электраэнергіі матар'ялу.

У чым «сакрэт» гэтых перамог? Адказ на гэта пытаньне дае аналіз форм і мэтадаў работы партыйных груп у гэтых брыгадах.

Брыгада стругалёў (24 рабочыя) налічвае 11 камуністаў, якія складаюць партыйную групу. Партыйная група пастаніла перад сабою задачу—на аснове рэалізацыі ўказаньняў тав. Сталіна, на аснове разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва дабіцца максымальнай прадукцыйнасьці працы, узьняць якасныя паказальнікі прадукцыі і г. д. Якімі-ж мэтадамі работы партгрупа ажыцьцяўляе пастаўленую перад сабою задачу?

На аснове поўнай добраахвотнасьці брыгада перайшла на гаспадарчы разрахунак. Кожны дзень перад пачаткам работы брыгадзір праводзіць 10-хвілінную вытворчую нараду, на якой брыгадны майстар вызначае дзенны вытворчы ліміт брыгады. Перад тым, як абгаворваць прад'яўленую вытворчую праграму, брыгада знаёміцца з вынікамі работы па гэтым вучастку вытворчасьці папярэдніх зьмен, са станам машын і інструментаў і на падставе гэтага высоўвае ў парадку сустрочнага пляну сваю дзенную праграму, якая, як правіла, перавышае плянавае заданьне. Ліквідацыя абязьлічкі і ўраўнілаўкі, індывідуальная прэміяльна-зьдзельная аплата працы забясьпечваюць у брыгадзе добры стан машын, узьдымаюць прадукцыйнасьць працы і яе якасьць.

Кожны месяц у поўна вызначаны дзень партарганізатар склікае сход партыйнай групы, на якім абмяркоўваюцца ў пераважнай большасьці пытаньні вытворчага і палітвыхаваўчага характару, правяраецца выкананьне тых заданьняў, якія даюцца парторгам кожнаму камуністу брыгады. Характар на, што на гэтых сходах заўсёды прысутнічаюць усе беспартыйныя ўдзельнікі брыгады. У брыгадзе стругалёў камуністы зьяўляюцца застрэльшчыкамі бальшавіцкіх тэмпаў работы, паказваюць прыклад узорнай барацьбы за прамфінплян. Калі сярэдні процант выкананьня прамфінпляну беспартыйнымі рабочымі брыгады складае 117,6, дык камуністы гэту лічбу ўзьнялі да 156.

У брыгадзе кожны дзень правяраецца якасьць выпрацаванай прадукцыі паасобнымі рабочымі за мінулы дзень. Пасьля выяўленьня недахопаў прозьвішчы канкрэтных посьбітаў зла заносяцца на чорную дошку. Нярэдкі выпадкі, калі вінаваты заўляе брыгадзе, што ён больш браку рабіць ня будзе, і просіць, каб яго прозьвішча з чорнай дошкі было зьнята. Значную дапамогу партгрупе ў барацьбе з недобрасумленнымі адносінамі да працы аказвае цэхавая штодзенка, у рабоце якое прымаюць актыўны ўдзел рабочыя брыгады стругалёў.

Асаблівую ўвагу партыйная група аддае пытаньню марксыцка-ленінскага выхаваньня. Усе камуністы і большая частка беспартыйных рабочых рэгулярна наведваюць цэхавыя партыйныя школы і гурткі.

Аналёгічныя мэтады і формы партыйнай работы і ў брыгадзе імя XII-га зьезду КП(б)Б (друкарня імя т. Сталіна). Характэрным для партыйнай групы гэтай брыгады зьяўляецца тое, што яна не замыкаецца ў вузкіх рамках сваёй брыгады (істотны недахоп у рабоце партгрупы стругалёў і інш), а на аснове сацыялістычнага спаборніцтва, пры дапамозе сумежных нарад з адстаючымі брыгадамі, множыць свой вопыт на прадпрыемстве, падцягвае ад сталых вучастк. Значная работа гэтай партгрупы праводзіцца ў напрамку павышэньня кваліфікацыі ўдзельнікаў брыгады. Да кожнага кваліфікаванага друкара (іх у брыгадзе 3) прымацаваны некваліфікаваныя і маладыя рабочыя.

Рад дадатніх момантаў у рабоце паасобных партгруп мы маем на лямцавай, абутковай і інш. прадпрыемствах Менску.

Аднак, гэтыя посьпехі не характарызуюць сабой агульнага становішча перабудовы партыйнай работы менскіх партарганізацый. Рад буйнейшых парткалектываў Менску недаацанілі ўсёй палітычнай важнасьці перабудовы партыйнай работы па-новаму, не замацавалі тых мерапрыемстваў, якія ў гэтым напрамку былі праведзены ў часе перавыбараў парторганаў у чэрвені і ліпені г. г.

Ёсьць выпадкі (фабрыка «Кастрычнік»), калі перабудова работы была праведзена фармальна. Некаторыя камуністы да гэтага часу ня ведалі аб тым, што яны зьяўляюцца парторгамі. У паасобных парткалектывах (Дрэваапрацоўшчык», «Полымя рэвалюцыі і інш.) была тэндэнцыя не разбуйняць ячэек, не папыраць сеткі партыйных груп. Асабліва дрэнна пастаўлена работа з перанясеньнем цэнтру цяжару партыйнай работы ў пізавое зьвяно вытворчасьці на чыгунцы. У парткалектыве цягі не арганізавана ні адна партыйная група. Ня лепшае становішча і на заводзе «Полымя рэвалюцыі».

Праверка паказала, што ў значнай частцы парткалектываў яшчэ не разумеюць арганізацыйных прынцыпаў трохступеннай структуры, не ўяўляюць тых задач, якія ўскладаюцца на партгрупы і партарганізатараў.

Істотным недахопам у рабоце большасьці парткалектываў зьяўляецца тое, што бюро цэхавых ячэек кіруюць пізавымі партыйнымі зьвеньнямі паогул. Рад партгруп не забясьпечаны аперацыйным канкрэтным кіраўніцтвам (абутковая фабрыка, друкарня імя Сталіна і інш.). Праверка выкананьня наладжана вельмі дрэнна, плянавасьці ў рабоце няма.

Агляд работы партгруп, які праводзіцца з мэтай выявіць усе недахопы ў рабоце парты

ХУТЧЭЙ ПРАСУНУЦЬ ТАВАР ДА СПАЖЫУЦА

Аб'яднаньні Белкаапсаюзу ігнаруюць дырэктывы аб разгортваньні савецкага гандлю

ВЯЛІКІЯ ЗАЛЕЖЫ ГАЛЁШ І ГАТОВАГА АДЗЕНЬНЯ

Паскаронае таваразвароту і разгортваньне савецкага гандлю мае вялікае значэньне для паляпшэньня рабочага спажываньня. Гэтага, аднак, ня хочуць улічыць некаторыя работнікі баз і складаў Белкаапсаюзу і яго аб'яднаньняў.

Ня гледзячы на сьігналы друку, на базах замарожана тавараў на сотні тысяч рублёў, што пацьвярджаецца радам фактаў, якія ўстаноўлены спэцыяльнай брыгадай бюро парткалектыву Белкаапсаюзу.

На базе прамтаварнага аб'яднаньня ў Менску каля 2-х тысяч ляжаць дзіцячыя цёплыя шапкі, ходкія на вёсцы. На запытаньне брыгады — чаму яны так доўга марынуюцца, загадчык складам спакойна адказаў: «тавар ня ходкі і яго ніхто не патрабуе». А дзіцячыя шапкі зьяўляюцца цяпер сэзонным таварам і вельмі патрэбны для школьнікаў.

На складзе гэтага-ж аб'яднаньня ўжо 6 дзён ляжаць 89 скрынак галёш на 50 тыс. рублёў. 100 кгр. вострадэфіцытнага поўсталу яшчэ 2-га сьнежня выпісаны Менскаму ЗВК, але тавар дагэтуль не рэалізаваны. 10 скрынак гарэзінаў на 20 тысяч рублёў ляжаць ужо некалькі дзён на складзе і не адгружаюцца, бо прамтаварнае аб'яднаньне не дае разнарадкі. Больш 5 дзён вялюцца і ня пушчаны ў продаж 2.000 пар бялізны на 10 тысяч рублёў. Такое-ж становішча і з гатовым адзеньнем на суму 25 тыс. рублёў, якое чакае разнарадкі. На складзе на працягу ўжо некалькіх месяцаў замарожана розных парфумэрных, касмэтычных і галянтарэйных тавараў на 36 тыс. рублёў.

Транспартная сэкцыя Белкаапсаюзу таксама праяўляе бюракратызм і непаваротлівасьць у паскарэньні таваразвароту. Так, на працягу 10 дзён на складзе транспартнай сэкцыі ляжала 900 пар цёплых шараваў, бялізны, коўдры.

Трэба адзначыць, што работнікі складаў і баз лічаць, што іх роля павінна зводзіцца толькі да выпіскі фактуры, а адпраўка тавараў іх не датычыць. Фактычна ад моманту выпіскі фактуры да адпраўкі тавар ляжыць на складзе ня менш 5-6 дзён.

На складах бакалейна-гастрэнамічнага аб'яднаньня выяўлена залежаў тавараў на 242 тыс. рублёў, у тым ліку фото-радыё-апаратуры на 165 тыс. рублёў.

Ня выконваецца пастанова ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб прыцягненьні да суровай адказнасьці вінаватых у злачынна нядбайнай нагрузцы тавараў. Так, 13-га сьнежня з магілеўскай шоўнай фабрыкі прыбыў у Менск 2 вагоны гатовага адзеньня навалам. Ад лесасэкцыі Цэнтрасаюзу таксама атрымаў вагон хустак навалам. Кіраўнікі некаторых аб'яднаньняў Белкаапсаюзу і работнікі баз прымірэнча адносяцца да гэтых злачынных фактаў і не паведамляюць адпаведным органам і грамадзкасьці.

Неабходна патрабаваць рашучай перабудовы работы ад усіх зьвеньняў спажывецкай кааперацыі. Трэба арганізаваць паказальныя суды над кашкрэтнымі вінаватымі ў замарожаньні таваразвароту і ігнараваньні дырэктыў партыі аб разгортваньні савецкага гандлю.

Брыгада парткалектыву Белкаапсаюзу:

КРЫЛАВІЦКІ, НАГЕРАЎ.

Замест савецкага гандлю--мэханічнае разьмеркаваньне

КРУПКІ.

Райсаюз ігнаруе дырэктывы партыі і ўраду аб паскарэньні таваразвароту. Замест 18-ці дзён, зварот тавараў працягваецца 34 дні. Райсаюз не перабудаваў сваёй работы, не пераключыўся на рэйкі разгортваньня савецкага гандлю. Ён больш займаецца мэханічным разьмеркаваньнем тавараў. Прыкладам такога мэханічнага разьмеркаваньня можа служыць гісторыя з газай. У мястэчку Крупкі жыхар, атрымаўшы значную непатрэбную яму колькасьць газы, абменьваў яе на сена, сала і г. д., у той час, калі ў многіх вёсках і калгасах газы не хапае.

Не разгорнуты самазагатоўкі. У крамах райсаюзу адсутнічаюць такія тавары, як соль, цукеркі, якія, як відома, не зьяўляюцца дэфіцытнымі.

Сыстэма райсаюзу робіць толькі першыя крокі па пераходзе на гаспадарчы разрахунак. У выніку адсутнасьці кантролю рублём навыкапана заданьне па мабілізацыі сродкаў.

У некаторых крамах і сталоўках райсаюзу яшчэ жыве «нэпманскі дух». Прыкладам можа служыць Крупская сталоўка, якая гоніцца за прыбыткам, і вусім ня цікавіцца якасьцю абедаў і паляпшэньнем абслугоўваньня наведвальнікаў. Недапушчальным трэба лічыць той факт, што значная частка работнікаў сельскай сеткі ня ведаюць апошніх пастаноў партыі аб перабудове кааперацыі.

Раённыя савецкія і партыйныя арганізацыі павінны дапамагчы спажывецкай кааперацыі выкараніць праяўленьні «нэпманскага духу» і тэндэнцыі мэханічнага разьмеркаваньня ў пасобных яе зьвеньнях і перабудаваць работу па-новаму.

Віцщеўскі.

Зьняць перашкоды са шляху разьвіцьця гаспадарча-разрахункових брыгад

Вялізарнае значэньне гаспадарча-разрахункових брыгад у выкананьні якасных паказальнікаў прамфінпляну, паляпшэньні арганізацыйнага плянаваньня, мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў, узмацненьне працдысцыпліны на аснове рэалізацыі шасьці умоў тав. Сталіна і г. д. — вядома. Бліскучыя посьпехі раду гаспадарча-разрахункових брыгад ленінградзкіх і маскоўскіх прадпрыемстваў (брыгады Капкова, Нікалаева, Давайніса), буйныя перамогі паасобных брыгад на прадпрыемствах БССР (брыгада кален на Гомсельмашы, шышэльніц — на «Чырвоным металісьце», Ранжцкага—на абутковай імя Лекерта, пайчэпніц — на ф-цы імя К. Цэткін, Аляшкевіча — на гарбарні «Бальшавік» і інш.) сьведчаць аб правільным шляху, выбраным ударнікамі-энтузіястамі пяцігодкі для датэрміновага выкананьня адказных задач, якія стаяць перад кожным сацыялістычным прадпрыемствам.

Але па гэтым шляху, на шляху разьвіцьця гаспадарча-разрахункових брыгад, усё яшчэ ёсьць значныя перашкоды, якія павінны быць і будуць зьнічтожаны дружным націскам рабочых, перадавых ударнікаў пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый.

„Самае балючае пытаньне"

На першай усебеларускай канфэрэнцыі гаспадарча-разрахункових брыгад дэлегаты, якія выступалі ў спрэчках па дакладах тав. Камзінтэйна і праф. Мэнава, прывялі нямала фактаў фармальных, бюракратычных адносін кіраўнікоў некаторых прадпрыемстваў да арганізацыі гаспадарча-разрахункових брыгад і іх работы.

Больш за ўсё скаргаў сыпалася на дрэнна пастаўлены ўлік або поўную адсутнасьць яго. На добрускай фабрыцы «Герой працы» няма нават уліку выпрацоўкі брыгадамі. У выніку, незалежна ад таго, ці дае рабочы 5 топ паперы, ці 6 з палоўай топ, заработак яго застаецца тым-жа. Адміністрацыя ўзвальвае ўлік на брыгадзіраў, але апошнія ня ведаюць, як яго правядзіць, просяць дапамагчы, а дапамогі ад адміністрацыі не сустракаюць (тав. Рахлін). Рабочыя новабеліцкага фанэрнага заводу просяць сваіх адміністратараў наладзіць хаця-б дзённы ўлік расходу драўніны, але адміністратары глухія і нямыя (тав. Аршанская). Няма ўліку работы брыгад і на магілеўскай рымарнай фабрыцы. Дэлегат ад фабрыкі тав. Вайнэр два дні дабіваўся вестак аб рабоце гаспадарча-разрахункових брыгад, але прыехаў на канфэрэнцыю амаль з пустымі рукамі. На заводзе імя Варашылава ўлік — «самае балючае пытаньне» (тав. Мэсэль). Да гэтага часу спрачаюцца: хто павінен весьці ўлік. Бухгальтарыя шяк ня можа вырашыць «складанага» пытаньня: ці павінна яна прымаць удзел у гэтай рабоце. Плянавы аддзел ф-кі «Сцяг індустрыялізацыі» не давярае ўліку брыгадзіраў, патрабуе абавязкова подпісу загатчыка цэхканторы або рахункавода (!), але нічога ім робіць, каб спрасьціць гэту справу і не прымушаць брыгадзіраў кожны дзень траціць час на пошукі «паручыцеляў» (тав. Лур'е).

Як відаць з гэтых фактаў, адсутнасьць уліку зьяўляецца галоўнай перашкодай на шляху разьвіцьця гаспадарча-разрахункових брыгад. Канфэрэнцыя ў сваіх рэзалюцыях абавязала ВСНГБ і яго аб'яднаньні не пазьней 15 сьнежня даць прадпрыемствам сыстэму ўліку работы гаспадарча-разрахункових брыгад, а інстытуту прамысловасьці, разам з інстытутам працы даручыла ў 10-дзённы тэрмін распрацаваць мэтадалёгію ўліку па кожнай галіне прамысловасьці. Гэтыя тэрміны прахадзяць. Што пасьпелі зрабіць ВСНГБ, аб'яднаньні і інстытуты за гэты час?

„Устаноўка" на „трэячку"

З пытаньнем аб уліку цесна зьвязана пытаньне аб прэміяваньні. Зразумела, што адсутнасьць дакладных вестак аб рабоце брыгады, выкананьні гаспадарча - разрахункових дагавораў, дасягнутай эканоміі ў матар'ялах, інструментах і г. д. пазбаўляе магчымасьці вызначыць суму прэміі.

Аднак, ёсьць прадпрыемствы, дзе нават наяўнасьць уліку не вырашае цалкам пытаньне аб прэміях. І ў гэтым зусім ясным пытаньні некаторыя адміністратары схільны займацца «выхадзіцтвам».

Пастанова ВСНГ СССР і УсеЦСПС ад 11 верасьня гэтага году дае зусім выразнае ўказаньне: «прэмія выплачваецца штомесячна і вылічваецца ад эканоміі, якую атрымлівае брыгада ў выніку перавыкананьня заданых адміністрацыяй у параўнаньні норм расходу сырцу, матар'ялаў, інструментаў, рабочай сілы. Памер прэміі (ад 20 да 60 проц. атрыманай эканоміі) дакладна ўказваецца ў дагаворы».

А на магілеўскай гарбарні імя Сталіна гавораць: «20 проц.—гэта вельмі многа, хопіць 10 проц. Дамо больш —рабочыя разбагацеюць». І на долю рабочага—ўдзельніка гаспадарча - разрахункової брыгады — часта прыходзіцца цэлая «трэячка» (тав. Гурвіч). Такой-жа «ўстаноўкі» («ня больш 10 процантаў!») прытрымліваюцца адміністратары новабеліцкага фанэрнага заводу (тав. Аршанская). Нямала прыхільнікаў «трэячак» ёсьць і на прадпрыемствах Гомелю (тав. Фэйгельсон). А вось на віцебскай шоўнай фабрыцы «Сьцяг індустрыялізацыі», паводле слоў тав. Лур'е, няма ніякіх «установак», там проста ня плошчаць прэміяльных. Восьмая камсамольская брыгада на працягу раду месяцаў перавыконвае колькасныя і якасныя заданьні. Аб гэтай брыгадзе напісалі нашму, цэлыя старонкі шматтыражкі прысьвячаюцца яе рабоце, брыгаду прадставілі да ўзнагароды орэнэм Працоўнага Чырвонага сьцягу, але камсамольцы да гэтага часу не атрымалі ні капейкі прэміяльных. Кіраўнік гэтай брыгады павінен атрымаць надбаўку ў памеры 15 проц. свайго заработку, але і ён на працягу вось ужо двух месяцаў нічога не атрымлівае.

Ці могуць стварыць такія бюракратычныя адносіны да прэміяваньня дадатковы стымул для далейшага разьвіцьця і росту гаспадарча-разрахункових брыгад, стымул для перавыкананьня прамфінпляну?

„Без гаспадарчага разрахунку спакайней"

Работнікі прадпрыемстваў апраўдваюць звычайна овае памылкі і сваю бязьдзейнасьць тым, што няма «адпаведных указаньняў». На канфэрэнцыі таксама быў рад выступленьняў — прафработнікаў, пам. дырэктароў і інш—са скаргамі па адсутнасьць кіраўніцтва ЦН саюзаў, ЦСПСБ, ВСНГ, аб'яднаньняў. Часткова гэтыя скаргі ўгрунтаваныя. Сапраўды, да апошняга часу рад прафарганізацый БССР і некаторыя гаспадарчыя аддавалі гаспадарча-разрахунковым брыгадам вельмі мала ўвагі. Але хіба толькі гэтым тлумачацца скажэньні ў брыгадным гаспадарчым разрахунку? Ці-ж толькі гэтым тлумачацца адсутнасьць уліку і абураючыя адносіны да пытаньняў прэміяваньня? Хіба толькі невыстарчальным кіраўніцтвам можна тлумачыць факты ўпартага нежаданьня некаторых адміністратараў перавесьці брыгады на гаспадарчы разрахунак? А такіх фактаў дэлегаты канфэрэнцыі прывозілі дзесяткі.

Вось у фанэрным цэху барысаўскага камбінату «Камінтэрн» ёсьць 4 лучшыя варыянты, кожны з гэтых закончаным тэхналёгічным працэсам. Абслугоўваюць варыянт 7 чалавек. Натуральна, што можна стварыць 4 гаспадарча - разрахункових брыгады. Але дырэктар камбінату парашыў стварыць адну гаспадарча - разрахункову брыгаду з 28 чалавек і, ня гледзячы на ўсе довады ЦП саюзу, доўга тармазіў гэту работу. Яму бачыце, лягчэй мець справу з адной брыгадай, чым з чатырма. Таму дырэктывы ВСНГ СССР і УсеЦСПС (п. 1 пастановы ад 11 верасьня) не абавязковы (тав. Міруц). Або возьмем магілеўскую гарбарню імя Сталіна. На гаспадарчы разрахунак пераведзена 12 брыгад, з якімі заключана 12 дагавораў. Але ні ў адным дагаворы не паказаны лічбовыя даныя прамфінпляну і расходу матар'ялаў. На пытаньне—чаму ў дагаворах няма лічбаў, кіраўнікі заводу адказалі: «ня было часу запоўніць, але брыгады ведаюць, за што трэба змагацца». А рабочыя гавораць: «Дагаворы падпісалі, але ў чым справа — ня ведаем» (тав. Гурвіч). На добрускай фабрыцы «Герой працы» загадчык паляровым аддзелам адну параду, прысьвечаную гаспадарчаму разрахунку, сарваў, не зьявіўшыся. На просьбы рабочых — перавесьці на гаспадарчы разрахунак — ён адказвае: «Бярэце хронамэтражыстаў, уста навеце нормы і пераходзьце». Гэтай гіранічнай парадай і абмяжоўваецца яго «дапамога» (тав. Рахлін).

Ці не гавораць гэтыя факты аб тым, што на некаторых прадпрыемствах ёсьць яшчэ шмат коснасьці і перазуменьня значэньня гаспадарча-разрахункових брыгад? Ці не гавораць яны аб тым, што многія адміністратары падыходзяць да гэтай важнейшай справы фармальна, ня гледзячы на рад выразных указаньняў вышэйшых гаспадарчых і прафсаюзных органаў?

Далейшы рост і разьвіцьцё гаспадарча-разрахункових брыгад зьяўляюцца адной з галоўных умоў пасьпяховай барацьбы нашай прамысловасьці за выкананьне якасных паказальнікаў прамфінпляну, за мабілізацыю ўнутраных рэсурсаў, за лепшую арганізацыю працы. Гаспадарча - разрахункова брыгада, як вышэйшая форма сацспаборніцтва і ўдарніцтва, заклікана ўзьняць ініцыятыву і энтузіязм шырокіх рабочых мас на яшчэ больш высокую ступень, мабілізаваць іх на хутчэйшае і поўнае ажыцьцяўленьне шасьці ўмоў тав. Сталіна, на пасьпяховае выкананьне пяцігодкі за чатыры гады і больш кароткія тэрміны.

Таму зьняць перашкоды са шляху разьвіцьця гаспадарча - разрахункових брыгад—баявая задача ўсіх партыйных, прафсаюзных і гаспадарчых арганізацый.

П-н.

Загатоўкі насеньня кармовых траў ПРАХОДЗЯЦЬ МАРУДНА

Апошняя дэкада не дала карэннага зруху

Апошняя дэкада не дала колькі-небудзь значнага зруху ў ходзе загатовак кармовых траў. Калі на 1 сьнежня плян загатовак быў выкананы на 4,3 проц., то на 10 сьнежня—на 5,5 проц. Такім чынам, мы маем прырост за 10 дзён усяго толькі на 1,2 проц. Калі плян загатовак цімафеёўкі выкананы на 35,4 проц. і лугавых траў на 18,8 проц., то на іншых культурах мы маем недапушчальныя паказьнікі. Так, па віцы плян выкананы на 6,3 проц., канюшыне—0,51 проц., сэрадэлі—1,8 проц.

Ня прыходзіцца даказваць, што зацяжка загатовак пагражае стварэньню магутнай кармовай базы для разгорнутай жывёлагадоўлі. Недавыкананьне пляну загатовак пацягне недасеў кармовых траў.

Ня гледзячы на зусім ясныя ўказаньні цэнтральных арганізацый аб тым, што насеньне кармовых траў у гэтым годзе ня будзе завозіцца і таму пасеўныя плошчы павінны быць забясьпечаны палкам мясцовым насеньнем, на мясцох яшчэ ня спыняюцца гутаркі аб «нерэальнасьці» плянаў. Замест таго, каб арганізаваць загатоўкі, некаторыя загатоўчыя арганізацыі злачынна бязьдзейнічаюць.

Так, ва Ўраравіцкім раёне пад прадлогам нерэальнасьці пляну ня лічаць патрэбным весьці якую-б там ні было масавую растлумачальную работу сярод калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкіх мас аднаасобнікаў, не жадаюць весьці барацьбу з сабатажам заможна-кулацкіх гаспадарак, якія ня выконваюць пляну здачы насеньня. Пасьля гутаркі ня дзіва, што значная частка кулацка-заможных гаспадарак у гэтым раёне яшчэ не атрымала цьвёрдых заданьняў. Ня гледзячы на ашчэрныя разважаньні раённых работнікаў, перадавыя калгасы здаюць насеньне дзяржаве. Так, калгас імя Энгельса арганізаваў абмалот вікі і па сваёй ініцыятыве здаў дзяржаве 59 цэнт. насеньня.

У Капыльскім раёне МТС да гэтага часу нічога не зрабіла для арганізацыі загатовак. У калгасах, якія ёю абслугоўваюцца, яшчэ не распачаўся абмалот насеннай канюшыны. У гэтым-жа раёне мы маем факты грубага парушэньня дырэктыў цэнтральных арганізацый. Тут дадумаліся замест загатовак насеньня зьбіраць захавальныя расьпіскі зд здатчыкаў. Гэта робіцца ў той час, калі да сканчэньня загатовак засталося ня больш 15 дзён.

Адным з асноўных тормазаў у загатоўках зьяўляецца таксама адсутнасьць належнай масавай работы сярод калгасьнікаў і бядняцка - сераднякіх мас аднаасобнікаў.

Усе гэтыя факты з усёй наглядзнасьцю паказваюць на палучасьць у радзе месц недаацэнкі загатовак кармовых траў. Толькі гэтым можна вытлумачыць, што загатоўкі праходзяць чарапашыны тэмпамі.

Апошні тэрмін загатовак канчаецца 1 студзеня 1932 году. Раённыя арганізацыі павінны па-баявому ўзяцца за гэту работу. Неадкладна арганізаваць абмалот насенных культур у калгасах і саўгасах. Там, дзе ня даны цьвёрдыя заданьні кулацка - заможным гаспадаркам, яны павінны быць зараз-жа даны і спатканы.

Плян загатовак насеньня рэальны, ён павінен быць выкананы ў тэрмін.

ЗВОДКА БЕЛКАНТОРЫ НАСЕНТРЭСТУ

аб ходзе загатовак насеньня кармовых траў па сэктарох БССР на 10 сьнежня 1931 г.

НАЗВА СЭКТАРУ.	Загатоўлена ў % да пляну					
	Віці	Сэрадэлі	Канюшыны	Цімафеёўкі	Лугавых	Усяго на сэктарох.
Дзяржсэктар	—	—	0,32	—	16,6	3,5
Калгасасаюз	9, 1	1, 5	0,57	67,2	23,9	7,8
Хлеблывёлсаюз	1,26	2, 4	0,5	18,4	48,3	1,53
Ільнакананьня-водсаюз	2, 5	—	0,38	0,33	—	2,2
Лесаюз	2,65	—	0,43	—	7,7	2,27
УСЯГО	6,3	1,8	0,51	35,4	18,8	5,5

„Партыйцы разважаюць аб нерэальнасьці пляну, а перадавыя калгасы самі здаюць дзяржаве насеньне

УВАРАВІЧЫ. «Зьвязда» ўжо сыгналізавала аб поўнай бязьдзейнасьці Ўраравіцкіх загатоўчых і калгасна-зямельных арганізацый у загатоўках насеньня траў і гародніны.

Але-ж гэтыя арганізацыі нічога не зрабілі для таго, каб па-бальшавіцку мабілізаваць масы калгасьнікаў і аднаасобнікаў на ліквідацыю ганебнага адставаньня на гэтым важнейшым вучастку.

За пяціднеўку з 5 па 10 сьнежня не загатоўлена ні аднаго кілё насеньня.

Райкалгасаюз нічога не зрабіў, каб пачаць загатоўкі ў калгасах. Адказныя работнікі райкалгасаюзу лічаць, што гэта кампанія ня можа быць выкананая. Так, член праўленьня райкалгасаюзу т. Карсакевіч кажа: «Няма чаго выконваць».

Ня гледзячы на тое, што РВК вызваліў ад здачы вікі калгасны сэктар нібы таму, што быў неўраджай яе, у некаторых калгасах вікі ёсьць і яны самі выпачылі для здачы дзяржаве. Так, калгас імя Энгельса сабраў 320 цэнт. вікі, з гэтага ліку 59 цэнт. выпачыў для здачы дзяржаве.

Некаторыя сельсаветы праяўляюць поўную бязьдзейнасьць у гэтым пытаньні. Лапіцкі сельсавет, атрымаўшы плян па загатоўках, падшыў яго да справы. У гэтым сельсавеце знаходзіцца па-за калгасамі толькі 58 гаспадарак. «Плянавікі» з РВК лічаць сельсавет суцэльна калектывізаваным і да аднаасобнага сэктару заданьня па загатоўцы насеньня не давялі.

Партыйныя арганізацыі Ўраравіцкага раёну павінны зьвяркуць самую сур'ёзную ўвагу на дапушчаныя палітычныя памылкі з боку РВК, неадкладна разгарнуць растлумачальную работу сярод аднаасобнікаў і даць цьвёрдыя заданьні кулацка-заможным гаспадаркам.

Б. Харыт.

М. НЕКРЫЧ

Як выглядае „ажыўленьне" у ангельскай прамысловасьці

Ні ў чым, бадай, так моцна не праявілася глыбіня і сіла сусьветнага крызісу, як у тых зьявішчах, якія мы назіраем за апошнія месяцы ў ангельскай эканоміцы. Калі 20-га верасьня брытанскі ўрад вымушан быў адмовіцца ад залатога стандарту, у Англіі і ў іншых краінах пачалася бокая ўзьнёпенасьць, што цяпер наступіць «росквіт» ангельскага вывазу. На працягу многіх год ангельскія прамыслоўцы гаварылі, што стабілізацыя фунта на вельмі высокім узроўні не дае ім магчымасьці з посьпехам канкураваць на сусьветных рынках. Як аб аксіёме, аб якой нельга спрачацца гаварылі, што раз фунт абясцэнен на 18-20 проц., значыць ангельскі экспарт атрымлівае як-бы адпаведную вывазную прэмію, і ангельскі гандаль нават не адчувае патрэбы больш у пратэкцыяністкіх тарыфах.

Сапраўды, у ангельскай прамысловасьці наступіла «ажыўленьне», але гэта «ажыўленьне» выявілася ня ў росьце вывазу, а толькі ў тым, што ангельскія прамыслоўцы, акрыленыя надзеямі і чакаючы патэнту заказаў, прынялі меры да паляпшэньня сваёй вытворчасьці. Адчыніліся даўно забітыя брамы многіх ланкаширскіх фабрык, больш жыва застукалі малаткі ў вэрфях і адналілася работа капальняў, якія былі закінуты з-за адсутнасьці збыту. Адным словам, стварылася, нешта накшталт бума. Ужо ў кастрычніку высьветлілася, што колькасьць паступаўных заказаў ні ў якай меры не адпавядала падрыхтоўкам і чаканьням прамыслоўцаў. На ніях былі ашуканы даныя за трэцюю дзесяцідзённку верасьня і за кастрычнік, г. зн. за той перыяд часу, калі ажыўленьне павінна было ўжо поўна выразіцца ў лічбах. Аказалася, што мелі рацыю перадавікі «Эканаміста», якія раілі «не сьпяшыць», радавацца. Статыстыка паказвае, што перыяд узмоцненых заакупак працягваўся ўсяго тыдзень-два пасьля краху фунта. Тлумачылася гэта, галоўным чынам, павічнымі пастроямі ангельскай спажывецкай масы, якая «выратоўвалася» ад папяровага фунту ў тавары. Адбылося тое, што так добра вядома ў кантынэнтальных краінах, якія прайшлі праз інфляцыю. Прадажная прэса нашыпталт «Дэйлі Мель», «Дэйлі Экспрэс» і г. д. угаварвала абываталя, што гэта і ёсьць той уздым, які чакаўся. Гэтыя даныя паказваюць, што ў той час, як ангельскі вываз узьняўся ў міжрэскалічных размерах,—увоз зрабіў рэзкі скачок уверх. У той час, як у першыя 8 месяцаў гэтага году сярэдні штомесячны ўвоз у Англію складаў 20,6 млн. фунтаў, у верасьні ён узьняўся да 22,6, а ў кастрычніку—да 27,2. Даныя аб увозе за першую дэкаду лістапада даюць падставу думаць, што ўвоз за гэты месяц дасягне рэкорчнай лічбы ў 35 млн. У прыватнасьці, поўнасьцю праваліліся разьлікі на вялікі рост вывазу ангельскага вугалю. Ужо ў сярэдзіне кастрычніка ў ангельскай эканамічнай прэсе пачалі зьяўляцца растураваныя водгукі аб працяжным застоі ў вугальнай прамысловасьці.

Трэба, між іншым, сказаць, што Ланкашыр рэальна адчуў узмоцнены прыток заказаў. Але гэта тлумачыцца прычынамі, якія ня маюць нічога агульнага з ростам «канкурэнта-здольнасьці» ангельскай прамысловасьці. Ангельская тэкстыльная прамысловасьць ажыла, з прычыны таго, што Японія вядзе вайну ў Манчжурыі. У адным з апошніх нумароў кіруючага органу ангельскіх тэкстыльных фабрыкантаў «Манчэстэр Гардыян Камэрпэль» проста гаворыцца, што «паведамленьні аб байкоце японскага тэкстыльнага кітайцамі — добрая навіна для Ланкашыру». Газэта ня ўтойвала, што «зацяжка канфлікту дасьць магчымасьць ангельскай тэкстыльнай прамысловасьці, як маленькі выкарыстаць нечаканы дар». Як гэта характэрна для сучаснага крызісу капіталістычнай эканомікі, што вываз з якой-небудзь краіны павялічваецца не ў рэзультаце росту спажываньня на адпаведным замежным рынку, ня з прычыны разьвіцьця новых рынкаў, а з-за таго, што канкурэнт часова аказаўся паралізаваным. Ёсьць поўная падстава верыць тым, якія сьцьвярджаюць, што адной з прычын гарачага падтрыманьня, якое бандыцкі нацад японскіх імпэрыялістаў па Манчжурыю сустрэў з боку Англіі, — гэта жаданьне, каб Японія выбыла на больш ці менш працяжны тэрмін з азіяцкіх і афрыканскіх рынкаў, дзе японскія тавары сыстэматычна выцясьнялі ангельскую прадукцыю. Нарэшце, дадамо, што непасрэдны раздражнік гандаль нават падзіўся ў кастрычніку на 5 проц., ня гледзячы на ўсеагульнае ажыўленьне запасаецца патрэбнай таварамі. Гэта паказвае, як моцна зьніжаецца ўжо за раз пакупная здольнасьць ангельскіх спажывецкіх мас. На гэты факт ужо вельмі заклапочана паказваюць эканамічныя органы друку.

Гэты фарсаваны імпарт апошніх 1-1½ месяцаў паслужыў крайнім пратэкцыяністам добрым повадам для разьвіцьця сваёй кампаніі за неадкладнае ўзьвядзеньне пратэкцыяністкіх тарыфаў. Для зразуменьня той сьвятлянскі, што адбываецца зараз у Англіі вакол пытаньня аб тарыфах, трэба на мятаць, што перамогшыя на выбарах кансэрватары, у першую чаргу прадстаўляюць інтарэсы разьцьеў, якія папярэдні ад краху фунта. Яны імкнуцца назад да залатога стандарту і, па ўсякім выпадку, дабіваюцца стабілізацыі фунту на як можна больш высокім узроўні. Але гэта немагчыма без адпаўленьня плацёжнага балянсу. Кансэрватары спадзяюцца дасягнуць сваёй мэты, хаця-б гэта прывяло да скарачэньня агульнага аб'ёму замежнага гандлю Англіі. Таму кансэрватары скарысталі гэтыя лічбы ўвозу, каб падняць крык, што трэба паставіць рагаткі перад «дэмпінгавым» увозам. Такім чынам, атрымліваецца, што адыход ад залатога стандарту, які павінен быў прывесьці да павялічэньня ангельскага вывазу, цяпер ужо аказаўся патробным для скарачэньня ўвозу ў Англію, што, зразумела, разважна пашкодзіць вывазу. Складаныя, з якіх стараецца плацёжны балянс, узлоды адноськавыя. Але перапалоханы буржуа, які баіцца за сваю рэнту, найдольны разумна разважаць і вось, амаль бяз спрэчак — прымнт закон аб барацьбе з «ненармальным» увозам, або, як яго яшчэ называюць для замятаньня сьляду, «антыдэмпінгавым» актам.

У акце, які ўступіў у моц 25-га лістапада, ёсьць 23 катэгорыі гатовых фабрыкатаў, якія будуць моцна абкладзены. Гэта абкладаньне раўнавагна ва многіх выпадках забарончай мыце. У сваім выкладаньні матываў, міністэр гандлю Рэнсымэн заявіў, што ў катэгорыі, якія падпадаюць абкладаньню, не ўваходзяць сыроц і поўфабрыкаты, бо гэта ўдаражала-б прадукцыі пераапрацоўчай прамысловасьці, што працуе на вываз. Але закон гэты пастольні неакрэсьлены і расьцяжны, што ісьпуюць вялікія разгалоскі адносна таго, які аб'ём ангельскага ўвозу ахапляецца законам. Сэр Рэнсымэн сьцьвярджае, праўда, некалькі глуха, — што закон ахапляе тавараў на 20 млн. фунтаў.

Орган кампартыі «Дэйлі Уоркер» гаворыць, што агульная колькасьць тавараў, якія падлягаюць абкладаньню на падставе новага закону, прадстаўляе сабою амаль трэцюю частку ўсяго ангельскага ўвозу. Газэта заяўляе, што за першыя 10 месяцаў гэтага году тавараў указаных 23 катэгорый увезена ў Англію на 215 млн. фунтаў (пры агульным увозе ў 701,97). Ісьціна зразумела на баку «Дэйлі Уоркер», бо ўсякая тактыка Рэнсымэна і лейбарыстскіх члонаў «нацыянальнага ўраду» заключаецца ў тым, каб змазаць сапраўднае значэньне пратэкцыяністкіх мер, якія прымаюцца імі. З гэтай мэтай закон уводзіцца быццам усяго на 6 месяцаў і мае нібы «пробны» характар. Але пры шалёным націску пратэкцыяністаў на ўрад і пры абсалютнай перавазе іх у парляманце, няма сумненьня, што праз 6 месяцаў закон гэты будзе распаўсюджан і на рад сырцовых прадуктаў. Ужо на днях нам. прэм'ера Бальдвін (ён-жа ўласьнік сталіцейных заводаў — Бальдвін і К°) даў зразумець, што ў недалёкай будучыне будуць увезены мыты таксама на сталь і жалезо. Пакуль што важна канстатаваць, што заявы, якія рабіліся ў верасьні аб тым, нібы абесцэненьне фунту на 18-20 проц. акружае Англію як-бы натуральнай мытнай сьцяной і вызваляе яе ад неабходнасьці перайсьці да пратэкцыяністкай сыстэмы — аказаліся яўным шуканствам, прызначаным для ўвядзеньня ўman малаінфармаванага ангельскага абываталя, які, да рэчы, па гэтых выбарах паказаў сваё здзіўленае невуцтва ў пытаньнях эканомікі.

Стварэньне мытнай сьцяны, зразумела, зараз-жа адаб'ецца на таварных цэнах на ўнутраным рынку. Падлічана, што ў сярэднім ангельскаму спажыўцу прыдзецца плаціць за тавары на 50 проц. больш, чым дагэтуль. Як прымуціць абываталя прымірыцца з гэтым падарожаньнем? І вось пачынаецца шырокая кампанія «Бай брыціш» (купляй брытанскія тавары). Цынц Уэльскі адкрывае зімовы кірмаш заклікам па радыё «падумаць аб бацькаўшчыне» і купляць толькі тавары, якія выробляюцца на бацькаўшчыне. Усюды сьветавыя рэклямы крычаць: «Бай брыціш». Забыты папярэджаньні таго-ж Рэнсымэна і Сноўдэна, што «мы маем большую патрэбу ў заграніцы, чым заграніца ў нас». Хваля гандлёвага шавінізму, калі можна так сказаць, шырока разышлася па ангельскіх рынках.

Да чаго ўсё гэта прывядзе? А вось да чаго. Не пасьпеў яшчэ новы закон увайсьці ў моц, як пачаліся контрэпрэсіі з боку дзяржаў, якія будуць кінуць ад новых мытных багатак. Швэйцарыя, Швэцыя, Чэха-Славакія, Францыя і ПАЗШ — усе яны ці ўжо прынялі меры «самаабароны», супроць ангельскага вывазу, які яны не без падставы называюць валютным дэмпінгам, ці зьбіраюцца гэта зрабіць. Пратэкцыяністы супакойваюць ангельскую публіку запэўненьнямі, што ангельскі вываз будзе пакіраваны ў калёніі і дамініёны, якія з лішкам, моў, узнагародзяць бацькаўшчыну за яе страты. Адным словам, гутарка ідзе аб так званым унутры-імпэрскім гандлі і пераўтварэньні брытанскай імпэрыі ў «самадавляючай» унутраны рынак». Асабліва многа ўвагі рабілі кансэрватары ў апошнія дні Канадзкаму прэм'еру Бэнэту і якраз менш усяго трэба было спасылацца на яго. Гэта ён у апошні час сьпешна праязду дадатковыя тарыфы для абароны інтарэсаў канадзкай прамысловасьці ад пагрозы ангельскага дэмпінгу. Гэта цяперашні канадзкі міністар гандлю Кэхан заявіў. «Без гэтых мер быў бы установлен прыцыцып, што ўрад другой краіны, ня лічачыся з нацыянальнымі інтарэсамі Канады, мог бы шляхам адвольнага абесцэненьня сваёй валюты, памяншаць даходы Канады ад яе ўласных мытняў і спрыяць павялічэньню беспрацоўя для таго, каб адпаведна павялічылася работа ангельскіх фабрык».

Як бачыць чытач, гутарка далёка ня любоўная. Канада гутарыць з Англіяй як канкурэнтам. Яшчэ больш рэзкую манэру гаварыць з Лёнданам усвоілі сабе паўднёваафрыканскія дзяржаўныя дзеячы. Асабліва прывязанасьцю да «бацькаўшчыны» адзначаецца ў апошні час Аўстралія, якая бачыць сваё адзінае выратаваньне ад банкрутства ў бесьперапынай фінансавай дапамозе з боку Лёндану. Непахісным фактам застаецца пакуль — і відавочна на доўгі час, — што асноўная база ангельскага замежнага гандлю — кантынэнтальныя краіны. Гэта было на днях лішні раз праілюстравана дадымі «эканаміста» аб замежным гандлі Англіі за першыя 9 месяцаў гэтага году. Сур'ёзная эканамічная прэса асьцярожна выказваецца, што ангельская прамысловасьць мае якую-небудзь будучыню толькі ў выпадку пагашэньня сваёй прадукцыі і ўжываньня радыкальнатарскіх мер, якія даўно ўжо праведзены ў іншых краінах.

Ужо зараз няма сумненьня, што п

Падзел Кітая пачаўся

Францускія войскі захватваюць паўднёвы Кітай

ВАШЫНГТОН, 14. «Івнінг Стар», камэнтуючы паведамленьне аб тым, што **ФРАНЦУСКІЯ ВОЙСКІ ЗАЙМАЮЦЬ ПАЎДНЁВЫ КІТАЙ** нібы для «прасьледаваньня бандытаў», піша:

«Гэтыя паведамленьні ня зьдзіўляюць некаторыя добра інфармаваныя колы ў Вашынгтоне. Яны толькі пацьвярджаюць атрыманыя тут нядаўна весткі аб існаваньні франка-японскай згоды, заключанай у 1928-29 г. Сучасныя падзеі ў Кітаі зьяўляюцца рэзультатам дзеяньняў, абмеркаваных у той час абодвума ўрадамі.

Паводле вестак з пэўных крыніц, адбыўся абмен візытамі паміж японскімі і францускімі афіцыяльнымі дзеячамі, што знаходзяцца ў Інда-Кітаі ў мэтах дасягненьня згоды **АДНОСНА НЕКАТОРЫХ РАЁНАЎ КІТАЮ**, якія «не павінны быць пад кантролем слабой і падкупной кітайскай адміністрацыі». Гэтыя раёны Кітаю, аб якіх ішла гутарка, былі з аднаго боку **МАНЧЖУРЫЯ**, а з другога—**ПРАВІНЦЫЯ ЮНАНЬ**. Як перадаюць, згода была канчаткова дасягнута ў часе прабываньня ў Парыжы японскага прынца».

Адстаўка Чан Кай-шы

ПАРЫЖ. Як паведамляе агэнцтва «Гавас» з Шанхая, Чан Кай-шы афіцыяльна падаў у адстаўку, пакінуўшы за сабою адных камандаваньне арміяй. Чакаецца таксама адстаўка міністра фінансаў Нанкінскага ўраду Суй Цзэвеня.

* *

БЭРЛІН. Адстаўка Чан Кай-шы зрабіла вялікае ўражаньне ў Германіі і разглядаецца ў палітычных колах, як важнейшая падзея ў жыцьці Кітаю ад часу ўзьнікненьня манчжурскага канфлікту. Так званыя «дэмакратычныя» газэты расцэньваюць адстаўку Чан Кай-шы як перамогу кантонскага крыла гаміндану над Нанкінам. Орган партыі цэнтра «Германія» і некаторыя правыя газэты бачаць у адстаўцы галоўным чынам посьпех Японіі. Пры гэтым газэты лічаць, што новынадкова Чан Кай-шы падаў у адстаўку адразу-ж пасьля стварэньня новага ўраду ў Японіі.

Лінь-сень—старшыня Нанкінскага ўраду

ШАНХАЙ, 15. Старшыня закападаў чай рады Лінь-сень уступіў на пост старшыні Нанкінскага ўраду. Чжэн Мін-шу—старшыня Гуандунскага ўраду—уступіў на пост старшыні выканаўчай рады.

ЦК францускай кампартыі заклікае рабочых да абароны СССР

ПАРЫЖ, 14. «Юманітэ» публікуе рэзалюцыю пленуму ЦК францускай кампартыі аб імпэрыялістычнай інтэрвэнцыі ў Кітаі і небясьпецы імпэрыялістычнай вайны супроць СССР. Рэзалюцыя зазначае, што імкненьне імпэрыялістычных дзяржаў да падзелу Кітая, разгрому кітайскага рэвалюцыйнага руху і да нападу на СССР выяўляецца з усёй яснасьцю.

Далей, рэзалюцыя адзначае памыўковаасьць пазыцыі партыі, а таксама падтрыманьне гэтай пазыцыі «Юманітэ» ў ацэнцы манчжурскіх падзей. Гэтыя памылкі праявіліся ў тым, што манчжурскія падзеі расцэньваліся галоўным чынам з пункту погляду супярэчнасьцяй паміж імпэрыялістычнымі дзяржавамі і ў перазуменьні таго, што, ня гледзячы на супярэчнасьці паміж імпэрыялістычнымі дзяржавамі, апошнія дзейнічаюць супольна супроць кітайскага рэвалюцыйнага руху і ў справе падрыхтоўкі нападу на СССР.

Гэтак сама зьяўляецца няправільнай ацэнка ролі Лігі нацый, як «бясьсільле і банкрутства», тады, як Ліга нацый, пад кіраўніцтвам францускага імпэрыялізму, адыгрывае самую актыўную ролю ў справе арганізацыі нападу супроць кітайскага рэвалюцыйнага руху і СССР.

Рэзалюцыя заклікае рабочых да рашучай барацьбы супроць падрыхтоўкі імпэрыялістычных войнаў, да арганізацыі сходаў і дэманстрацый на заводах і на вуліцах у абарону СССР. Рэзалюцыя заклікае ўзмацніць работу на ваенных прадпрыемствах, арганізаваць байкот вытворчасьці і транспарту ваенных матар'ялаў, выкрыць здрадніцкую ролю рэфармістаў і мінарытарыяў і арганізаваць рух беспрацоўных.

У заключэньне рэзалюцыя заклікае партыйныя арганізацыі ўзмацніць работу з навабранцамі і салдатамі, выступаючы ў абарону іх асобных патрабаваньняў эканамічнага характару, дамагаючыся зьніжэньня тэрміну вайсковай службы да 6 месяцаў, прымаючы шэфства над казармамі.

Нячуванае завастрэньне супярэчнасьцяй паміж капіталістычнымі краінамі

БЭРЛІН, 10. Штотыднёвыя зводкі нямецкага кан'юктурнага інстытуту прыводзяць цікавы агляд мер, якія ўжыты ў розных краінах з мэтаю зьменшыць увоз замежных тавараў у гэтыя краіны. Агляд падзяляе гэтыя меры на 8 катэгорый.

Да першай катэгорыі адносяцца мерапрыемствы валютнага нарадку, рэзультатам якіх зьявілася зьніжэньне курсу валюты адпаведных краін, што фактычна прывяло да падзеньня імпарту ў гэтыя краіны і да росту іх экспарту. З ліпеня 1931 году на канец кастрычніка быў скасаваны залаты стандарт у Англіі, Мэксіцы, Брытанскай Індыі, Балівіі, Швэцыі, Парвэгіі, Даніі і Фінляндыі, у рэзультаце чаго курс валюты гэтых краін рэзка ўпаў. Апрача таго, за гэты перыяд вельмі ўпаў курс валюты ва Уругваі, Бразіліі, Аргентыне, Вэнэцуэле, Эквадоры, Аўстраліі, Новай Зэляндыі. У Даніі, Эгіпце і Канадзе быў за гэты перыяд выдан закон аб забароне вываз золата, што таксама пацягнула за сабой падзеньне курсу валюты гэтых краін.

Да другой катэгорыі мерапрыемстваў пратэкцыянісцкага характару агляд адносіць дзяржаўнае рэгуляваньне гандлю валютай. За апошні перыяд такое дзяржаўнае рэгуляваньне гандлю валютай уведзена ў Англіі, Італіі, Швэцыі, Даніі, Грэцыі, Брытанскай Індыі, Аргентыне, Чылі, Уругваі, Паўднёвай Афрыцы, Чэхаславакіі, Югаславіі, Бразіліі. Баўгарыі, Аўстрыі, Вэнгрыі, Фінляндыі, Эстоніі, Латвіі, Нарвэгіі, Гішпаніі, і Турцыі. Пры гэтым у Чэхаславакіі, Югаславіі, Бразіліі, Баўгарыі, Аўстрыі, Вэнгрыі, Фінляндыі, Эстоніі і Латвіі рэгуляванне гандлю валютай зьвязана з пэўнымі правіламі продастаўленьня валюты для імпарту, прычым гэтыя правілы ў радзе выпадкаў зводзяцца да фактычнай забароны імпарту пэўных тавараў.

Да трэцяй катэгорыі агляд адносіць дзяржаўнае рэгуляваньне замежнага гандлю. Сюды адносіцца манаполія замежнага гандлю збожжавымі прадуктамі і мукой, уведзеная ў Югаславіі, дзяржаўнае рэгуляваньне ўсяго імпарту ў Гішпаніі, імпартная манаполія на аграрныя прадукты, каменны вугаль, газу і рад прамысловых вырабаў у Эстоніі, дзяржаўнае рэгуляваньне амаль усяго імпарту ў Турцыі. Апрача таго, у апошні час міркуецца ўведзеньне імпартнай манаполіі ў Эстоніі.

У чацьвертую катэгорыю ўваходзяць розныя забароны ў адносінах да імпарту. Тут агляд пералічвае наступныя забароны, выданыя за апошнія месяцы: у Польшчы забаронен увоз важнейшых угнаеньняў, у Бразіліі—раду вырабаў машынабудаўнічай прамысловасьці, у Калумбіі—прадметаў раскошы, у Ісляндыі—шматлікіх тэкстыльных вырабаў і прадметаў раскошы, у Даніі—віна. Далей ідуць краіны, якія ўстанавілі кантынгентаваньне імпарту. У Чэхаславакіі кантынгентаваны ўвоз збожжа і мукі, у Аўстрыі — увоз жывёлы і мяса з Румыніі і лесу і нямецкі — з Чэхаславакіі, у Бэльгіі кантынгентаваны ўвоз вугалю з Германіі, у Францыі—увоз лесу, малочных прадуктаў, мяса, мясных вырабаў, рыбы і гішпанскіх він, у Латвіі—увоз шкляных вырабаў, цэмэнту, электрычных лямпачак, скуры і радыё-апаратуры і ў Турцыі кантынгентаван увоз шматлікіх тавараў. Міркуецца далей пашырэньне кантынгентаваньня ўвозу у Чэхаславакію, Латвію, Турцыю і ўвядзеньне кантынгентаваньня ў Швэйцарыі і Францыі.

Потым агляд спыняецца на праведзеных за апошні час павышэньнях мытных тарыфаў. Вельмі павышаны мыты ў Англіі, Італіі, Польшчы, Даніі, Румыніі, Баўгарыі, Фінляндыі, Канадзе, Парагваі, Уругваі, Брытанскай Індыі, Калумбіі, Аргентыне, паўднёвай Афрыцы. Міркуецца далейшае павышэньне мыт у Францыі (часткова ўжо праведзена пасьля апублікаваньня агляду), у галяндзкай Індыі, Уругваі, Бэльгіі, Бітаі, Галяндыі, Швэцыі, Англіі, ПАЗШ, Японіі, Югаславіі, Францыі і Турцыі.

Далей, да мерапрыемстваў, накіраваных супроць імпарту замежных тавараў, агляд далучае законы аб прымусовым спажываньні мясцовага збожжа ў Італіі і Фінляндыі, аб прымусовым спажываньні мясцовага цукру ў Латвіі і гандлёвую манаполію на жыта і ншаніцу ў Баўгарыі.

Нарэшце, у апошнім сваім разьдзеле агляд пералічвае рад іншых, накіраваных супроць імпарту замежных тавараў, мерапрыемстваў: антыдэхінгоўныя палажэньні ў Аргентыне, Галяндыі і Францыі, увядзеньне новых экспартных прэмій у Польшчы і абмежаваньні імпарту, якія міркуюцца ў Даніі і Швэцыі. Такім чынам, гэты агляд яркі характарызуе тое **нячуванае завастрэньне супярэчнасьцяй паміж усімі, без выключэньня, капіталістычнымі краінамі, якое зьявілася вынікам сусьветнага эканамічнага крызісу, што ўсё больш пагаўбляецца.** (ТАСС).

Далейшае паглыбленьне крызісу ў Германіі

БЭРЛІН, 13. Далейшае паглыбленьне эканамічнага крызісу ў Германіі знаходзіць сваё выяўленьне ў запіпадзе вытворчасьці, звужэньні рынку, скарачэньні збыту і ў зьмяншэньні экспартнай выручкі. Гэта выклікаецца неабходнасьцю прадаваць тавары па выключна нізкіх цэнах з прычыны канкурэнцыі, якая завастрэцца на сусьветных рынках. Усагульнае рашучае зьніжэньне зарплаты мае сваім вынікам далейшае паглыбленьне крызісу збыту, асабліва для прамысловасьці, што вырабляе сродкі спажываньня. Выплаўка чыгуну зьнізілася ў Германіі ў лістападзе **да 426.670 тон** супроць **434.211** тон у кастрычніку. Сярэдняя дзённая выплаўка чыгуну складае толькі **36,6** проц. сярэдняй дзённай выплаўкі чыгуну ў пасьляваенны перыяд. Крызіс германскай сельскай гаспадаркі выяўляецца ў зьніжэньні даходнасьці яе.

Паводле даных германскага кан'юктурнага інстытуту агульны даход германской сельскай гаспадаркі ў 1931-32 г. расцэньваецца ў **6,6 млрд.** марак супроць **8-мі** млрд. марак у 1930-31 годзе, у **9 млрд.** марак— у 1929-30 г. у **9,3 млрд.** марак—у 1928-29 г.

Паглыбленьне аграрнага крызісу і зьбядненьне германскага селянства знаходзіць свой адбітак, у прыватнасьці, і ў крызісе германскіх сельска-гаспадарчых каапэратываў: толькі за лістапад у Германіі ліквідаваліся з прычыны фінансавых цяжкасьцяй, банкрутстваў і г. д. **81 сельска-гаспадарчы каапэратыў і 29 сельска-гаспадарчых ссуда-шчадных кас.** (ТАСС).

Мытная вайна паміж Германіяй і Швэйцарыяй

БЭРЛІН, 14. Швэйцарскі ўрад сёньня пераніяў скасаваць з 4-га лютага свой гандлёвы дагавор з Германіяй. Скасаваньне дагавору азначае **пачатак мытнай вайны** паміж дзьвюма краінамі.

Зьніжэньне вырабу чыгуну і сталі

ПАРЫЖ, 12. У эканамічным дадатку да «Энізэвэ Бельж» надрукаваны даныя аб зьніжэньні вырабу чыгуну і сталі ў галоўных капіталістычных краінах. У Англіі выплаўка чыгуну ў кастрычніку бягучага году ў параўнаньні з кастрычнікам 1930 году, паменшылася **на 31,5 проц.**, а выплаўка сталі—**на 10,75 проц.**, у ПАЗШ адпаведна—**на 45,8 проц.** і **41,5 проц.**, у Германіі—**на 36,5 проц.** і **29,25 проц.** (ТАСС).

Кангрэс адтэрмінаваў зацьверджаньне мараторыя

ВАШЫНГТОН, 14. У розьультаце моцнай апазыцыі з боку абедзьвюх партый, Гувэр часова адмовіўся ад спроб прадоўжыць мараторы і дамагаецца скарачэньня даўгоў. Зараз ён дамагаецца ад кангрэсу толькі зацьверджэньня ўжо існуючага мараторыя, абвешчанага Гувэрам у той час, калі кангрэс быў распушчан. Заўтра фактычна рад эўрапэйскіх дзяржаў акажацца ў становішчы «несостоятельных должников» у адносінах да ПАЗШ, бо гувэраўскі мараторы зьяўляецца незаконным без зацьверджэньня кангрэсу, а гэта заньвярджэньне відавочна затрымаецца на некалькі тыдняў. (ТАСС).

Крызіс у Францыі

ПАРЫЖ, 10. Кожны тыдзень прыносіць з сабой усё бальшае паглыбленьне эканамічнага крызісу ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі і ва ўсіх краінах Францыі. Так, выпуск чыгуннага ліцьця ў кастрычніку бягучага году склаў толькі **637.000 тон** супроць **654.000 т.** у верасьні бягучага году і **827.000**—у кастрычніку мінулага году. Выпуск сталі ў кастрычніку складае толькі **626.000** тон супроць **656.000** у папярэдні месяц і **797.000** тон—у кастрычніку мінулага году. Колькасьць працуючых домнаў зьнізілася ў кастрычніку да **103** супроць **139** у кастрычніку мінулага году. Афіцыяльная статыстыка сьведчыць таксама аб бесьпераперыўным зьніжэньні гуртовых цэн на сырэц ва Францыі (ТАСС).

За жалезную дысцыпліну на транспарце

На барацьбу са здарэньнямі і парушэньнямі графіка сьледаваньня цягнікоў

Аб'яднаны лістападаўскі пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б з усёй сілай падкрэсьліў, што становішча працоўнай дысцыпліны на чыгуначным транспарце **«ўсё яшчэ застаецца нездавальняючым».**

Побач з фактамі высокага творчага энтузіязму, самаахвярнасьці і ўдарніцтва, ёсьць яшчэ і факты грубага парушэньня працдысцыпліны.

Партыя ня можа дапусьціць, каб з прычыны расхлябанасьці, косапасьці, бюракратызму, па віне паасобных прагульшчыкаў, гультаёў і п'яніц зьмяншаліся тэмпы пагрузкі, зрывалася спаранная язда, ня выконваўся графік сьледаваньня цягнікоў па раскладзе і г. д.

Адным з вынікаў заняпаду працоўнай дысцыпліны на паасобных вучастках чыгуначнага транспарту БССР зьяўляецца значная колькасьць здарэньняў і сыстэматычны зрыў выкананьня графікаў сьледаваньня цягнікоў па раскладзе.

Даволі ўказаць на тое, што толькі на працягу аднаго лістапада па чыгунках БССР было 339 здарэньняў, прычым 156 выпадкаў спыненьня цягнікоў у дарозе.

Віцебскі раён, як і раней, адрозьніваецца павялічэньнем здарэньняў і невыкананьнем графіку сьледаваньня цягнікоў па раскладзе. У лістападзе было 162 здарэньні, прычым 14 выпадкаў псаваньня паравоза, 60 выпадкаў спыненьня цягнікоў у дарозе і 48 выпадкаў разрыву цягнікоў.

Ад **Віцебскага** не на многа адстаюць **Гомельскі** раён, які меў на працягу лістапада 65 здарэньняў, **Жлобінскі**—60 і **Аршанскі**—52 здарэньні.

Ні адзін з эксплёатацыйных раёнаў БССР да гэтага часу яшчэ не дабіўся 100%-нага сьледаваньня цягнікоў па раскладзе. Па **Віцебскім** раёне ў лістападзе таварныя цягнікі сьледавалі па раскладзе толькі на 44 проц., а па пасажырскіх цягнікох—на 40 проц.

Такое-ж становішча на **Гомельскім, Жлобінскім і Аршанскім раёнах.** Усё гэта зьяўляецца вынікам нераспарадчасьці, злачынай падбайнасьці паасобных станцыйных агентаў, дыспэтчараў.

Такога становішча з працоўнай дысцыплінай надалей нельга цярпець. У гэтым пытаньні трэба дабіцца карэннага пералому ў бліжэйшы час.

Сацыялістычнаму чыгуначнаму транспарту патрэбна бальшавіцкая жалезная дысцыпліна.

Аб'яднаны лістападаўскі пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б абавязаў партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі чыгуначнага транспарту БССР лічыць **«задачу рашучай барацьбы за працоўную дысцыпліну, як адну з важнейшых і асноўных задач».**

Да XVII канфэрэнцыі УсеКП(б) чыгуначныя арганізацыі БССР павінны прыйсьці з канкрэтнымі перамогамі ў справе ўзмацненьня працоўнай дысцыпліны.

Спазьненьні цягнікоў ня спыняюцца

Трэці раён з пастаўленымі перад ім задачамі партыяй аб 100-процантным сьледваньні цягнікоў па раскладзе не спраўляецца.

Цягнікі па-ранейшаму ідуць з вялікім спазьненьнем. Калі за апошнюю дэкаду лістапада быў некаторы зрух, то першая дэкада сьнежня дае рэзкае пагаршэньне.

Процант сьледаваньня цягнікоў па раскладзе у сярэднім дае за дэкаду па таварным руху 44,3 проц. і па пасажырскім—65,7 проц.

4 сьнежня з 28 таварных цягнікоў прайшло па раскладзе толькі 8, што складае 28,5 проц. Галоўныя прычыны—доўны рамонт паравозаў, вагонаў, нядбайная адносіны да службовых абавязкаў паравозных брыгад, агентаў, зьвязаных з рухам цягнікоў, і нявыразнасьць работы суседніх чыгунак і раёнаў.

Нявыдача паравозаў у вызначаны тэрмін зрывае своячасовае адпраўленьне цягнікоў з распараджальных станцый. 4 сьнежня на віне аршанскага дэпо по несваячасова выданы паравозы пад цягнік № 975 і 970 і 1 сьнежня—пад цягнік № 758.

Спазьненьні і нявытрымка паперагонпага ходу ў дарозе стылі сыстэматычным зьявішчам. Машыніст Назараў паравоза № 3112 прывёў цягнік № 765 у Барысаў са спазьненьнем на 5 гадз. 35 мін. Меў спазьненьне ў дарозе машыніст **Пажарыцкі**, які сьледаваў з цягнікам 973, і **Крыцкі**—з цягнікам № 625.

Цягнікі несваячасова фармуюцца на распараджальных станцыях. Так, 1 сьнежня несваячасова сфармаваны састаў цягніка 976 на ст. Барысаў, 765—на ст. Ворша і 980—на ст. Менск.

Ёсьць такія брыдкія факты, калі кандуктарская брыгада з Менску ў Негералае адпраўляецца бяз зімовай вопраткі. У выніку брыгада, прыехаўшы ў Негералае (2 сьнежня), адмовіліся ехаць з цягнікам № 982 і замест яе паехалі стрэлачнікі.

На лепшае становішча з пасажырскімі цягнікамі. Сьледаваньне па раскладзе пасажырскіх цягнікаў за апошнія дні першай 5-дзёўкі сьнежня по перавышае 50 проц., а 3-га сьнежня яно нават склала 42,8 проц.

Двухтыдневік барацьбы за 100-процантнае сьледаваньне цягнікоў па раскладзе ня быў скарыстаны для мабілізацыі мас на выкананьне дырэктыў партыі і загаду т. Андрэева па гэтым пытаньні.

Брыгада «Зьвязды»: **Якаўлеў, Міхайлаў, Васільеў.**

Паведамленьні

20 сьнежня, у 7 гадз. веч., у памяшк. Дому Асьветы (Камуністычная, 19) склікаецца IX УСЕБЕЛАРУСКІ ЗЬЕЗД САЮЗУ ПРАЦАЎНІКОЎ АСЬВЕТЫ. Парадак дня: 1) Даклад ЦК саюзу працаўнікоў асьветы; 2) справаздача ЦП саюзу Беларпрацаўнікоў; 3) даклады НКАсьветы: а) аб праграмах і арганізацыі мэтадычнага кіраўніцтва, б) аб педагагічных кадрах, в) аб школьным будаўніцтве; 4) выбары.

— **ПК ЦКК КП(б)Б** просіць т. Біта Максіма Герасімавіча зьявіцца ў ПК ЦКК КП(б)Б, ці паведаміць свой адрас. Просьба да ўсіх арганізацый і тавары-шоў, якія ведаюць месцазнаходжаньне т. Біта, паведамляць у партклеціў ЦКК КП(б)Б.

— **Бюро скаргаў ЦКК-НК РСІ** сёньня, 16-XII, у 6 з пал. гадз., у памяшк. Гар савету (плошча Волі, заля пасяджэньняў) праводзіць агульна-гарадзкую нараду актыву бюро скаргаў, на якую запрошаны прадстаўнікі інспэктары, рабочыя засядацелі БС, добраахвотнікі БС, «ЛК», рабкоры і запрашаюцца рабочыя. Парадак дня:—Аб працы бюро скаргаў ЦКК-НК РСІ Бел. і ўдзел мас у працы.

— Сёньня, у 7 гадз. веч., у памяшк. НДІ прамысловасьці (плошча Волі) адбудзецца даклад пашыраной сэкцыі на тэму: «Скарыстаньне ільнянай кастры ў папяровай прамысловасьці». Запрашаюцца ўсе зацікаўленыя.

— **Дэкаднік** камакадэміі. Сёньня, 16 сьнежня, у 7 гадз. веч. адбудзецца даклад т. Арцеева С. Т. на тэму: «Кандэнсацыйныя і баразьба партыі супроць правага і левага ўхілаў у аграрным пытаньні».

— **Дом Прасьветы.** 17 сьнежня, у 7 гадз. веч. адбудзецца адкрыты сход партклеціўцаў працасьветы. У парадку дня—разбор ліста т. Сталіна. Дакл. т. Рыўліна. Запрашаюцца усе асьветнікі.

— 16 сьнежня, у 6 гадз. веч., у прыродазнаўчым корпусе ВДУ (плошчаі № 114) адкрываецца скліканая НДІ кам выкананьня канфэрэнцыя базавых устаноў інстытуту. Запрашаюцца ЦК ЛКСМБ, ЦБ ДКА, НКА БССР, члены т-ва пэдагогаў-марксыстаў, т-ва дзяцтвазнаўства і кіраўнікі пінэрскіх баз.

ПАПРАЎКА

Ва ўчарайшым нумары «Зьвязды» ў артыкуле Е. Б. Пашуканіса—«Аўладаць макрсызка-ленінскай тэорыяй». у трэцяй калёнцы, першым абзацы, другім радку зьнізу надрукавана: «...што галоўнае ў ленінізьме—не праблема дыктатуры пралетарыяту». трэба чытаць:» **...што галоўнае ў ленінізьме—праблема дыктатуры пралетарыяту».**

Адказны рэдактар М. ГАРЫН.

МЕНГАРКОМ КП(б)Б 16 сьнежня, у 2 гадз. дня склікае НАРАДУ САКРАТАРОЎ ПАРТ. ЯЧЭК САВЕЦКІХ УСТАНОЎ І НАВУЧАЛЬНЫХ разам з старшынямі ГРУПКОМАЎ, МЯСЦКОМАЎ і ПРАФКОМАЎ—партыйцаў, па пытаньні правядзеньня 5-ДЗЕНЬНІКА ШТУР МУ МАБІЛІЗАЦЫІ СРОДКАЎ. Яўка абавязкова.

19 СЬНЕЖНЯ—УСЕБЕЛАРУСКАЯ НАРАДА РЭДАКТАРОЎ ГАЗЭТ.

19 СЬНЕЖНЯ 1931 Г., РОЎНА Ў 5 ГАДЗ. ВЕЧАРА, У ЗАЛІ ЦК КП(б)Б НАЧЫНАЕ СВАЮ РАБОТУ ЧАРГОВАЯ УСЕБЕЛАРУСКАЯ НАРАДА РЭДАКТАРАЎ ЦЭНТРАЛЬНЫХ І РАЁННЫХ ГАЗЭТ БССР.

У ПАРАДКУ ДНЯ:

1) ЗАДАЧЫ ДРУКУ Ў СУВЯЗІ З НАДЫХОДЗЯЧАЙ XVII-УСЕСАЮЗНАЙ ПАРТЫЙНАЙ КАНФЭРЭНЦЫЯЙ І XIV ЗЬЕЗДАМ КП(б)Б (ДАКЛАД. ТАВ. ШАРАНГОВІЧ).

2) АБ ЧАРГОВЫХ ЗАДАЧАХ РАБОТЫ ПА КОНКУРСЕ «ПРАВДЫ» НА ЛЕПШНУЮ РАБОТУ ПАСЬЦЕННЫХ ГАЗЭТ САЎГАСАЎ, МТС І КАЛГАСАЎ ПА АРГАНІЗАЦЫЙНА-ГАСПАДАРЧЫМ УМАЦАВАНЬНІ КАЛГАСАЎ (ДАКЛ. ТАВ. КУРЦІК).

а) СУДАКЛАДЫ РЭДАКЦЫЙ УСІХ РАЁННЫХ ГАЗЭТ АБ ПРАРОБЛЕНАЙ ПА КОНКУРСЕ РАБОЦЕ.

3) АБ ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА УСЕБЕЛАРУСКАЙ НАРАДЫ ЦЭХАВЫХ І БРЫГАДНЫХ ГАЗЭТ (Т. ВІТЛІН).

У РАБОЦЕ НАРАДЫ ПАВІННЫ ПРЫНЯЦЬ УДЗЕЛ РЭДАКТАРЫ ЦЭНТРАЛЬНЫХ І РАЁННЫХ ГАЗЭТ БССР, А ТАКСАМА КАМУНІСТЫ-РАБОТНІКІ ЦЭНТРАЛЬНЫХ ГАЗЭТ.

РЭДАКТАРЫ РАЁННЫХ ГАЗЭТ ПАВІННЫ АБАВЯЗЕОВА ПРЫВЕЗЬЦІ З САБОЙ ПАДРАБЯЗНУЮ ПІСЬМОВУЮ СПРАВАЗДАЧУ АБ РАБОЦЕ ПРАРОБЛЕНАЙ Ў СУВЯЗІ З КОНКУРСАМ «ПРАВДЫ». ПРЫЯЖДЖАЮЧЫМ ТА ВАРЫШОМ НЕАБХОДНА ЗЬВЯРТАЦЦА ДА Т. РАМАНОЎСКАЙ (ПАКОЙ № 15).

КУЛЬТПРОП ЦК КП(б)Б.

21 сьнежня, у гор. Менску склікаецца

XII-ты пленум ЦСПСБ

З наступным парадкам дня:
1) Вынікі VI-га пленуму УсеЦСПС.
2) Арт. пытаньні VII-га Усебеларускага зьезду прафсаюзаў.
Яўка членаў і кандыдатаў пленуму абавязкова.

Прэзыдыум ЦСПСБ.

Да другой сэсіі ЦВК БССР X скліканьня.

Другая сэсія ЦВК БССР X скліканьня адкрываецца **16 сьнежня** у 6 г. 30 м. веч. у гор. Менску, у клюбе харчавікоў.

ПАРАДАК ДНЯ НАСТУПНЫ:

1) Даклад СНК БССР аб кантрольных лічбах народнай гаспадаркі БССР на 1932 год.
2) а) даклад СНК БССР аб дзяржбюджэце БССР на 1932 год, б) судаклад бюджэтнай камісіі ЦВК БССР па дзяржаўным бюджэце на 1932 год.
3) Даклад Капыльскага, Заслаўскага і Лепяшынскага РВК аб гаспадарчым і культурным будаўніцтве раёнаў.
4) Даклад Калгасцэнтру БССР аб арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў.
5) Аб месавай рабоце савецаў.
6) Зацьвярджэньне важнейшых пастаноў, прынятых паміж сэсіямі ЦВК БССР.

Сакратар ЦВК БССР **М. Гніляковіч.**

Пасяджэньне фракцыі ЦВК БССР адбудзецца там-жа **16** сьнежня ў 5 гадз. веч.

Кіно **„Чырвоная Зорка"** Ад серады, 16 сьнежня

НОВЫ ГУКАВЫ ГАВАРАШЧЫ МАСТАЦКІ ФІЛЬМ

ШТОРМ

драма ў 6 частках.

Рэжысэр—**Леўкоў.**
Аператар—**Гіндін.**
Кампазытар—**С. Пятоцкі.**
Мастак—**Утнік.**

У ГАЛ. РОЛЯХ:
Васька „Бомба"—арт. МХАТ—ЯНШЫН.
Куза—арт. т. „Рэвалюцыі"—ЛАЎРЭНЬЦЕЎ.
Аставчук—АНТОНАЎ.
Пётра-мышыніст—арт. т. „Рэвалюцыі" ПАЛЯКОЎ.
Андрэічук—САКАЛОЎСКІ.
Іван Ягорыч.
Капітан парах. „Ермак"—Нар. Арт. Рэсп. ПЕЎЦАЎ.
Сьляпы гарманіст—БАЖАНАЎ.

ЗВЫШ ПРАГРАМЫ:
Пасіфік (Пазма аб паравозе) ГУКАВЫ ФІЛЬМ у 1-ой частцы.

Штодзённа 4 сеансы
Пачатак у 6 г., 7-30, 9 і 10-30
Касса—ад 1 гадз.

Дзеці ў кіно не дапускаюцца.
Пасьля III званка ўваход у залю забаронены.

„Культура" Пач.: 7, 8-45, 10-30 — Маставіцкі ўсходні фільм **АНУШ** Звыш праграмы: **Лодырам конец**

Інтэрнацыянал Адкр. з 12 г. дня. — **ЭЛЕН ГЫХТЭР** у каміедыі **МАРАЛЬ.** Звыш праг. кіно-хроніка Саюзкіно

„Пралетары" Адкр. з 12 г. дня — Гарольд Лойд у зьменным фільме **МЯЛОДШЫ СЫН.**

„Юны Піянэр" (будынак кіно „Культура") — Маставіцкі фільм **ПАРТФЭЛЬ ДЫЯНУР'ЕРА** Звыш праг.—хроніка. Пач. 1 г., 2-30. Каса—ад 11 г. ран.

„СПАРТАК" Пач. 7, 9 і 11 Каса—ад 5 гадз. — Сёньня вядомы фільм **„Коллежский регистратор"** У гал. ролі вядомы артыст **Масьвін.**

Менгарана

з 1 студзеня 1932 г. адкрывае

8-месячныя настаўніцкія курсы

для падрыхтоўкі настаўнікаў 1-га канцэнтру у ліку 120 асоб з сэкцыямі: беларуская, яўрэйская, польская.
На курсы будуць залічаны асобы, якія маюць адукацыю ня ніжэй 7-годкі. Асобы, якія маюць адпаведную падрыхтоўку, але ня маюць дакументаў, могуць трымаць іспыты пры мясцовых аддзелах народнай асьветы. Слухачы будуць забясьпечаны стыпэндыяй і інтэрнатам (без пасьцельнай бялізны). Заявы прымаюцца да 25 сьнежня. Да заяў неабходна дадаць наступныя дакументы: а) пасьведчаньне аб адукацыі, б) аб сац. становішчы і паходжаньні, в) аб стане здароўя, г) аб адносінах да вайсковай павінасьці. Заявы прымаюцца ў Гарана (плошча Волі, будынак Гарсавету).

ЗАГАДЧЫК ГАРАНА МАСЛАКОЎ.

БЕЛАРУСКАЯ КАНТОРА

ўсесаюзнага аб'яднаньня кармовай прамысловасьці

„САЮЗПРАМКОРМ"

адкрывае у гор. Менску ў студзені 1932 г.

2-месячныя КУРСЫ на 60 асоб па падрыхтоўцы рахунковых працаўніковў для раённага зьвяна і Беларускай канторы „Саюзпрамкорм".

Жадаючыя паступіць на гэтыя курсы павінны мець адукацыю ня ніжэй 7-годкі і ўзрост не маладзей 18 год. У першую чаргу прымаюцца тыя, якія працавалі на рахункаводстве і жадаюць працаваць у раённым зьвяне сыстэмы Саюзпрамкорму. Усім залічаным на курсы будзе прадастаўлен інтэрнат або будзе выдана па 15 руб. у месяц на наём кватэры, на харчаваньне—65 руб., сэкейным будуць выплачвацца сутачныя па 2 р. 50 к., або захоўваецца атрымліваемая пенсія. Кошт праезду на курсы і да месца працы за кошт Саюзпрамкорму, але ня звыш 20 р. у адзін канец. Ня ўсіх залічаных на курсы бярэцца падпіска працаваць у сыстэме Саюзпрамкорму ня менш аднаго году.

Заявы падаюцца на адрас: г. Менск, Саюзпрамкорм, Нямёга № 9, на ім. Капрызлая.

Нам. упаўнаважанага Белканторы „Саюзпрамкорм" **Сідаровіч.**

УВАРАВІЦКІ аўта-трактарны ТЭХНІКУМ

абвяшчае дадатковы **ПРЫЁМ** студэнтаў на 1-ы **КУРС.**

У першую чаргу прымаюцца рабочыя, трактарысты, шофэры і ваўнаважатыя. Жадаючыя паступіць у тэхнікум павінны да 1/I—32 г. падаць на імя тэхнікуму заяву з наступнымі дакумантамі: 1) аб адукацыі, (ня ніжэй 7-годкі), 2) аб сац. становішчы, 3) рабочым стажы, 4) узрослае, 5) аб адносінах да вайсковай службы, 6) аб здароўі, 7) засьведчаную анкету і ўзяўе фота-карткі. Асобы, якія ня скончылі 7-годкі, будуць трымаць іспыты па агульна-адукацыйных дысцыплінах. Інтэрнатам забясьпечваюцца ўсе студэнты, стыпэндыяй—65 проц. Аб залічэньні і часе прыезду будзе кожнаму паведамлена.

Заявы накіроўваюцца на адрас: пл. Уваравічы, Аўтатрактарнаму тэхнікуму. Для адказу прыкладасьці марак на 30 кап.

Дырэкцыя.

Сэктар кадраў Белптушка-кролікаводнага ТРЭСТУ

абвяшчае **прыём** студэнтаў

НА 1-шы КУРС ТРУДАЎСКАГА ПТУШКАВОДНАГА ТЭХНІКУМУ.

У першую чаргу ў тэхнікум прымаюцца рабочыя, калгасьнікі, у другую чаргу—беднякі. Жадаючыя паступіць у тэхнікум, павінны да 25-XII—31 г. падаць на імя тэхнікуму заяву з наступнымі дакумантамі: 1) аб асьвеце (ня ніжэй 6 груп савегодкі), 2) аб сацыяльным становішчы, 3) аб узросьце, 4) аб здароўі. Асобы, якія ня маюць дакумантаў аб асьвеце, будуць трымаць іспыты з 27 па 30 сьнежня па наступных дысцыплінах: бел. мова, грамадазнаўства, матэматыка, фізыка. Прынятыя студэнты забясьпечваюцца стыпэндыяй і інтэрнатам, згодна палажэньня аб сельгастэхнікумах. Заяву з дакумантамі накіраваць па адрасе: ст. Ярэтуны, саўгас „Труды", Полацкага раёну, тэхнікуму.

СЭКТАР КАДРАЎ БЕЛПТУШКА-КРОЛІКАВОДНАГА ТРЭСТУ.

Выйшаў, разасланы падпісчыкам і паступіў у продаж.

№ 11 **„БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ"** № 11

ЗЬМЕСТ

І. Сталін.—Аб некаторых пытаньнях гісторыі бальшавізму (ліст у рэдакцыю часопісі „Пролетарская рэвалюцыя").
**Перадаві